PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 50 (2483) Год XLVIII | Беласток, 14 снежня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Новае консульства

Аляксандр Вярбіцкі

26 лістапада 2003 года адбылося ўрачыстае адкрыццё Консульства Рэспублікі Беларусь у Белай-Падляшскай. Гэта чацвёртае — пасля Варшавы, Гданьска і Беластока — дыпламатычнае прадстаўніцтва Беларусі ў Польшчы. Консульства ў сапраўднасці адкрыта і працуе ўжо з ліпеня гэтага года, а цяпер ладзілася толькі афіцыйная ўрачыстасць; магчыма, што яна была прымеркавана да IX Польска-беларускага эканамічнага форуму „Добрасуседства-2003", які ў гэты час адбываўся ў Белай-Падляшскай.

На мерапрыемства было запрошана шмат знатных гасцей; на вока з'явілася каля сямідзесяці. Прыбылі м.інш.: Аляксандр Міхневіч — віцэ-міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Тадэуш Паўляк — амбасадар РП у РБ, Анджэй Куроўскі — люблінскі ваявода, Генрык Макарэвіч — маршалак Люблінскага ваяводства, Аліна Чарняўска і Анджэй Крэнтоўскі — консулы РП у Брэсце і Гродне, Іван Грыцак — консул Украіны ў Любліне (украінскае консульства ў Любліне адкрыта крышку раней — у верасні г.г.), Ян Сычэўскі — прадстаўнік Управы Падляшскага ваяводства, Віктар Бурскі — былы амбасадар РБ у РП, прадстаўнікі замежных ведамстваў РП і РБ, мясцовага самакіравання з абодвух бакоў граніцы, Памежнай стражы, паліцыі, бізнесу, банкаў, парламентарыі ад Люблінскага ваяводства. Быў амбасадар РБ у РП Павел Латушка і консулы РБ у Беластоку і Гданьску. Гаспадаром новай установы з'яўляецца віцэ-консул Ігар Сякрэта, які крыху раней працаваў у беластоцкім Генконсульстве РБ.

Былі кароткія прамовы. Амбасадар Павел Латушка выказаў упэўненасць, што дзверы Консульства будуць шырока адкрыты ўсім яго наведвальнікам, ды аптымізм і надзею ў перспектыўнасць эканамічнага польска-беларускага супрацоўніцтва.

Віцэ-міністр Аляксандр Міхневіч падзякаваў усім, хто прычыніўся да паспяховага адкрыцця новай установы, якую лічыць важным фактарам стабільнасці ў беларуска-польскіх адносінах. Заявіў ён таксама пра волю беларускага боку аказваць падтрымку беларускай меншасці ў Польшчы і спрыяць яе ўсебаковаму развіццю.

Януш Скалімоўскі — дырэктар Консульскага аддзела варшаўскага МЗС, выказаў пажаданне, каб новая ўстанова была дастойнаю такой грацыёзнай краіны як Беларусь, каб была месцам плённых сустрэч абодвух народаў.

Эдуард Сокалаў, які прадстаўляў улады Брэсцкай вобласці, выказаў спадзя-

[працяг ☞ 2]

Фота ІАЛАНТЫ КАБЗАР

Эдуард Акулін і Юры Гумянюк

Бязмежжа 2003 — ахова ўласнага панадворка!

Ганна Кандрацюк

Пасля абеду, калі гайнаўскія рэстаратары смажылі каўбаскі з дзіка для гасцей „Бязмежжа", у нашу рэдакцыю завітаў неардынарны кнігаман. Як пазней высветлілася, студэнт і самавук у беларускасці.

— У мяне да вас справа, — сказаў замест прывітання.

— Асабістая? — здзівілася я.

— Не, — паправіўся госць, — я прыйшоў па Глёбуса.

Наш госць, пакуль купіў кніжку, з асалодай гартаў старонкі „Дамавікамерона".

— Ёсць яшчэ польскі пераклад, — інфармую.

— То *папроша* яшчэ і пераклад, — пажадаў наведвальнік.

Адам Глёбус стаў вядомы ў Польшчы, менавіта, дзякуючы „Бязмежжу" і польскамоўнаму перакладу „Дамавікамерона". І зараз, хоць адсутнічаў у Гайнаўцы целам, напісаў апавяданне пра падарожжа мінскіх літаратараў. (У дарозе, за Мінскам, на іх аўтобус наехала аўтафура).

Аазіс на беларускай пустыні

На VIII беларуска-польскі літаратурны семінар „Бязмежжа", які праходзіў 21-23 лістапада ў Гайнаўцы (у гатэльчыку „Ажахоўскі"), са сталіцы Беларусі шчасліва даехала трое аўтараў: Барыс Пятровіч, Паліна Качаткова, Эдуард Акулін. Разам — суставальнікі і рэдактары літаратурна-мастацкага часопіса „Дзеяслоў", паасобку — выдатныя аўтары.

„Дзеяслоў" — аазіс на беларускай культурнай пустыні.

— У аўтараў цэнім талент, — кажа Барыс Пятровіч, галоўны рэдактар. — У нас няма ні палітычных, ні пакаленнавых крытэрый.

Побач літаратараў-зорак як Святлана Алексіевіч, Рыгор Барадулін, Янка Брыль, Адам Глёбус, друкуюцца там дэбютанты, і пераклады замежнай літаратуры.

— Наш поспех і ў прысутнасці незалежнай публіцыстыкі з галіны культуры, — дадае Барыс Пятровіч.

За год існавання выйшла шэсць нумароў часопіса. Выдавецтва дзейнічае амаль на віртуальных прынцыпах. Няма ў іх памяшканняў і штатаў.

— Затое мы здольны ўжо на сябе зарабіць і плаціць ганарары, — кажа Барыс Пятровіч.

Акно ў свет

Пад знакам дарожнай катастрофы дабіраліся ў Гайнаўку сябры-рэдактары польскага часопіса „Карткі". Дарогу, ужо пад Галяковай Шыяй, загарадзіла аварыя легкавушкі з супрацьлеглага боку. Каб даставіць на запланаваную гадзіну празаіка Міраслава Грыку, госці павярнулі са шляху і дабраліся акружной дарогай. Катастрафічныя матывы, якія незалежна ад межаў праследавалі ўдзельнікаў „Бязмежжа", навялі свайго роду нервовасць, але і яна саступіла ўжо пасля першага выступлення. Міраслаў Грыка з сімпатыяй і цеплынёй гаварыў пра польска-беларускія сяброўствы ў штодзённасці і ў сваіх „Апавяданнях з-над Нарвы".

— „Карткі" для нас — узор, — узяў голас Барыс Пятровіч, — мы паказваем

[працяг ☞ 3]

Што спыніць парушэнні? ☞ 2

Беларускія ўлады адмаўляюць структурам Міжнароднай арганізацыі працы працаваць згодна статуту гэтай арганізацыі на тэрыторыі Беларусі. Літаральна ў пачатку лістапада ўрад адмовіў у рэгістрацыі праектаў, што тычыліся пытанняў абароны працоўных і развіцця прафсаюзнага руху. Вынікам такога стаўлення сталася нота пратэсту з боку МАП да беларускага прадстаўніцтва ў Жэневе.

Беларусь патрэбна толькі беларусам ☞ 4

Беларусь не надта адрозніваецца ад іншых краін Сярэдняй і Усходняй Еўропы. Часта маю нагоду параўноўваць гарады Польшчы і Беларусі, але вялікай розніцы не заўважаю. На вуліцах і тут, і там машыны заходняй вытворчасці.

Грошы, за якімі трэба хадайнічаць ☞ 5

Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі пачало акцыю інфармавання вяскоўцаў як правільна рыхтаваць заяўкі на атрыманне даплаты да ўгоддзяў, за якой можна будзе хадайнічаць пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза.

Зберагчы ад забыцця ☞ 8

Даўняе вяселле прадставілі „Васілёчкі" з Бельска. Кіраўнік хору Мікола Мяжэнны паінфармаваў, што паказаны вясельны абрад у 90% згодны з вясковымі пераказамі з Бельшчыны. „Трэба звяртаць вялікую ўвагу, каб абрады не страцілі аўтэнтычнасці", — кажа Мікола Мяжэнны — выкладчык Факультэта свят і абрадаў Гродзенскага каледжа мастацтваў.

Асвячэнне ніжняй царквы ☞ 9

Іканастас і прастол у ніжняй царкве выканалі і пазалацілі майстры з Ковеля на Украіне. Яны таксама за ахвяраванні Міколы Гайдука з Гайнаўкі напісалі іконы ў іканастас. Завяршаюцца ўжо працы ў іканастасе верхняй бакавой царквы, у які іконы напісаў настаўнік Гайнаўскага белліцэя Міхал Юшчук. Зараз абкладаецца мазаікай іканастас галоўнай царквы Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля.

Беларускі каляндар „Нівы" на 2004 год...

... з'явіцца ў наступным нумары нашай газеты — каля 21 снежня г.г.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Чорная ноч над газетай „День”

Афіцыйна перарэгістраваная 5 лістапада 2003 года газета „День”, права на выдаванне якой займелі сёлета супрацоўнікі забароненай „Пагоні”, так і не пабачыла свет. У журналісцкіх колах Беларусі шырыцца думка, што ўлады распаўсюдзілі сярод дзяржаўных і прыватных друкарняў негалосную забарону на друк новай грамадска-палітычнай газеты.

Пасля двухгадовага перапынку ў выпуску газеты, журналісты колішняй „Пагоні” вельмі ўсцешыліся, што зноў займеюць уласнае выданне. Новае пасведчанне аб рэгістрацыі газеты „День”, падпісанае міністрам інфармацыі і друку Беларусі Уладзімірам Русакевічам, было своеасаблівым „карт-бланшам” і падштурхнула да актыўнай падрыхтоўкі першага нумара.

Папярэднюю згоду на друкаванне „Дня” ў Гродне дала дырэктарка Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні Таццяна Міронава. Але пасля, праз шараговую супрацоўніцу, паведаміла рэдакцыйнаму калектыву, што друкаванне газеты „День” у Гродне немагчымае. З неафіцыйных крыніцаў стала вядома, што начальнік грамадска-палітычнай інфармацыі Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Амелька „не рэкамендаваў” Таццяне Міронавай брацца за друкаванне газеты, супрацоўнікам якой з'яўляецца Мікола Маркевіч, асуджаны „за абразу прэзідэнта”.

Паколькі афіцыйны офіс „Дня” і галоўны рэдактар Генадзь Барбарыч знаходзяцца ў Мінску, дык і саму газету вырашылі друкаваць у сталіцы. Былі заключаны дамовы з прыватнай друкарняй „Светач” на друк, а таксама з мінскай і гродзенскай філіямі Белсаюздруку на распаўсюджванне газеты праз цэнтралізаваную сістэму кіёскаў. Але, калі ўсё было дакладна падрыхтавана, супрацоўнікі паліграфічнага прадпрыемства „Светач” нечакана паведамілі, што ў іх зламалася друкарская машына, і яны акрамя „Дня” не змаглі аддрукаваць яшчэ шэсць газет. Маўляў, з-за гэтага панясуць матэрыяльныя страты і г.д.

— Насамрэч высветлілася, што ніякая машына не зламалася, — гаворыць Мікола Маркевіч, які знаходзіўся падчас інцыдэнту ў Мінску. — Проста, як я зразумеў, найвышэйшае кіраўніцтва распаўсюдзіла негалосную забарону на друкаванне „Дня” ў Беларусі...

Каб высветліць сітуацыю, Мікола Маркевіч запісаўся на аўдыенцыю да міністра інфармацыі і друку Уладзіміра Русакевіча, але той яго не прыняў і перанёс сустрэчу на чацвёртае снежня.

Першага ж снежня на сходзе супрацоўнікаў „Дня” абмяркоўваліся праекты друкавання газеты за межамі Беларусі на выпадак, калі сустрэча з міністрам Русакевічам не прынясе пазітыўных вынікаў. Але гэта пацягне за сабой значна большыя выдаткі на паліграфію, „растаможку” і транспарт. Дарэчы, мытныя пошліны за „растаможку” (у тым ліку і газетаў, якія друкуюцца за мяжой) спаганяюцца не толькі на мяжы Беларусі з „натаўскай” Польшчай ці „нядобразычлівай” Літвой, але і „братняй” Расіяй.

Ігар Гандлеўскі

У памяць паэтэсы, хрысціянкі...

Першы ў Беларусі помнік выдатнейшай нацыянальнай паэтцы — Ларысе Геніюш урачыста быў асвечаны ў суботу, 29 лістапада, у Зэльве. Помнік устаноўлены побач з праваслаўнай царквой, насупраць дома, дзе жыла паэтка. Дазвол на гэта даў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт.

Напачатку чатыры святары з Гродна адслужылі літургію на беларускай мове ў мясцовым Траецкім храме, а затым асвяцілі помнік. Тыя, хто прысутнічаў падчас цырымоніі, былі папросту ўражаны адбыўшымся. Анатоль Белы, ініцыятар устаноўкі помніка (кіраўнік мінскага гарадскога культурна-асветніцкага клуба „Спадчына”), быў вельмі ўзрушаны і дзякаваў беларускім святарам за зробленае. Кожнаму з іх ён уручыў памятныя керамічныя медалі. Прафесар Саламонаў, вядомы ў Беларусі інтэлігент, сказаў, што сёння адбываецца найвялікшая падзея ў Беларусі — гэты дзень можна назваць па праву паваротным да беларускай інтэлігенцыі.

Адзіны палітык, які прысутнічаў на ўрачыстасці, Пятро Краўчанка зазначыў, што вельмі ўдзячны беларускай Царкве за тое, што ў гэтыя хвіліны яна знаходзіцца побач са сваім народам. Ён узгадаў аб тым, як, будучы амбасадарам у далёкай Японіі, неаднойчы перачытваў „Споведзь” Ларысы Геніюш і лічыць гэты твор дагэтуль самым значным у мемуарным жанры беларускай літаратуры.

Сакратар Гродзенскай епархіі айцец Анатоль казаў, што „Ларыса Геніюш служыць сапраўдным прыкладам змагання за веру для ўсіх нас, і мы ўсе хацелі б быць падобнымі да яе”. Ён узгадаў яе пакутлівы шлях пасля таго, як Ларыса Геніюш вярнулася з савецкіх лагераў і ніколі не адракалася ад Царквы, а, наадварот, заўсёды яе бараніла: „Вялікую карысць маюць сёння тыя намаганні, якія робяцца, каб ушанаваць памяць паэтэсы, памяць хрысціянкі, памяць проста добрага і сумленнага чалавека. І таму сёння мы молімся, каб Гасподзь даў сілы кожнаму з нас быць падобнымі на яе”.

Ларысу Геніюш у 1948 годзе арыштавалі разам з мужам у Празе і вывезлі ў СССР. Вярнулася яна ў Зэльву з ГУЛАГу ў 1956 годзе. Паэтка адмовілася прыняць савецкае грамадзянства і памерла ў 1983 годзе грамадзянкай Чэхаславакіі. Беларускія ўлады дагэтуль яе не рэабілітавалі.

Міхаіл Карневіч

„Биржа информации”, 4.12.2003 г.

Што спыніць парушэнні правоў?

Крок за крокам беларуская ўлада працягвае аддаляцца ад агульнапрынятых норм і правіл паводзін у цывілізаваным свеце. Найбольш яскрава гэта адбываецца ў галіне правоў і свабод чалавека. Адным з яркіх прыкладаў фіксацыі такога аддалення стала стварэнне Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП) камісіі па расследаванні парушэнняў правоў прафсаюзаў у Беларусі. Наступствы працы такой камісіі, калі выкладзеныя ў адпаведнай скарзе факты знойдуць пацвярджэнне, будуць мець на беларускую эканоміку дрэнны адбітак.

Аб тым, што адміністрацыя Аляксандра Лукашэнкі ставіцца да прафсаюзнага руху ў краіне вельмі нервова, распавядалася неаднойчы. У тым ліку і на старонках „Нівы”. Найбольшым „поспехам” такой нервовасці стала адзяржаўленне найбуйнейшай прафсаюзнай арганізацыі — Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) — пасля пройгрышу яе тагачасным кіраўніком Уладзімірам Ганчарыкам прэзідэнцкіх выбараў 2001 года. Нягледзячы на тое, што ФПБ была арганізацыяй 4 млн. беларускіх грамадзян, вытрымаць такую паразу яна не здолела — перагукнулася савецкае мінулае, калі прафсаюзы лічыліся „прывадными пасамі” партыі і „вагаліся” разам з яе лініяй.

Разам з тым, узніклы як альтэрнатыва былым савецкім прафсаюзам незалежны прафсаюзны рух, нягледзячы на сваю малалікасць, прыцягвае да сябе ўвагу баявітасцю і паслядоўным адстойваннем правоў працоўных. Іх лідэры не баяцца трапіць за краты за свае думкі і арганізацыю, хай сабе малалікіх, але акцый пратэсту. Менавіта таму і сталі такія прафсаюзныя аб'яднанні аб'ектам рэпрэсіўных дзеянняў з боку лукашэнкаўскага рэжыму, які, як гэта было ўжо неаднаразова, грэбуе міжнародным правам дзеля падаўлення іншадумства і незалежных асацыяцый.

Менавіта аб гэтым ішла гаворка на Жэнеўскай канферэнцыі МАП, што адбылася амаль паўгода таму. Занепакоенасць парушэннямі правоў працоўных на свабоду аб'яднанняў прымусіла гэтую арганізацыю звярнуцца да беларускіх улад з патрабаваннем тлумачэнняў і спынення парушэнняў. Што тычыцца першага, то ўсе свае дзеянні лукашэнкаўская адміністрацыя тлумачыць выкананнем уласнага заканадаўства. А што тычыцца спынення фактычнага пераследу, то тут усё адбылося наадварот — за час прайшоўшы пасля канферэнцыі за кратамі пабывалі тры найбольш актыўныя дзеячы незалежнага прафсаюзнага руху, адбылася фактычная ліквідацыя незалежнага прафсаюза авіядыспетчараў. Больш таго, беларускія ўлады адмаўляюць структурам МАП працаваць згодна статуту гэтай арганізацыі на тэрыторыі Беларусі. Літаральна ў пачатку лістапада ўрад адмовіў у рэгістрацыі праектаў, што тычыліся пытанняў абароны працоўных і развіцця прафсаюзнага руху. Фармальнай падставай было патрабаванне ўзгаднення зместу праектаў з беларускімі ўладамі, што супярэчыць механізму працы МАП з прафсаюзамі і наймальнікамі. Вынікам такога стаўлення сталася адпаведная нота пратэсту з боку МАП да беларускага прадстаўніцтва ў Жэневе.

Але гэта, як кажуць, паўбяды. Зважаючы на працяг беларускімі ўладамі палітыкі на прыцясненне незалежнага прафсаюзнага руху ў краіне, МАП цяпер прыняла рэдкае рашэнне аб стварэнні адмысловай камісіі па расследаванні парушэнняў. Праца камісіі, што складаецца з трох юрыстаў, будзе цягнуцца каля года. У беларускай улады ёсць шанц, па меншай меры, на працягу гэтага тэрміну не дапускаць паўтарэння парушэнняў і неяк выправіць тыя, што мелі месца.

На жаль, маецца вялікае сумненне, што незалежныя прафсаюзы ўздыхнуць гэтым часам вольна. Асабліва зважаючы на сталую „зачыстку” апазіцыйнага грамадска-палітычнага сектара. Але ў даным выпадку могуць пацярпець не толькі прафсаюзы — пацвярджэнне фактаў грубага ў Беларусі парушэння правоў людзей на аб'яднанні верагодна пацягне за сабой эканамічныя санкцыі з боку Еўрасаюза, які пазбавіць краіну гандлёвых прэферэнцый. Вынікам чаго стане страта не толькі крыніц паступлення ў Беларусь валюты, але і рынкаў збыту беларускай прадукцыі, паслядоўнасцю чаго, зразумела, будзе рост беспрацоўя. Ці гэтага прагнуць беларусы?

Уладзімір Лапцэвіч

Новае консульства

[1 ☞ працяг]

ванне, што граніца будзе адно лініяй на карце.

Ваявода Анджэй Куроўскі паведаміў, што запрашае консула на ўсе мерапрыемствы, якія кранаюць узаемнага супрацоўніцтва. Працаўнікам консульства пажадаў, каб адчувалі сябе як ва ўласным асяроддзі.

Духавы аркестр брэсцкага гарнізона выканаў дзяржаўныя гімны Рэспублікі Беларусь і Польшчы, а консул Ігар Сякрэта падняў сцяг Рэспублікі Беларусь. Прамоўцы разрэзалі сімвалічную чырвона-зялёную стужку...

Новае консульства РБ у Белай-Падляшскай вельмі патрэбнае ў сённяшні час, бо ж галоўныя камунікацыі з Беларусі ў Польшчу выходзяць не толькі з Гродна, але і — ці не найважнейшыя — з Брэста. Нягледзячы на палітычныя складанасці наглядаецца рост эканамічных узаемаабаротаў паміж Беларуссю і Польшчай. Ды і часова прытарможаны ўвядзеннем віз рух людзей праз граніцу вяртаецца ў ранейшае русло.

Будынак Консульства Рэспублікі Беларусь у Белай-Падляшскай, якое размясцілася па вуліцы Сітніцкай, 77, выглядае як прытульны катэдж. На першым паверсе яго знаходзяцца прыёмная для наведвальнікаў і службовыя кабінеты. Другі паверх займаюць жылыя памяшканні працаўнікоў установы і рабочы кабінет консула. Перад будынкам шмат прасторы, абшырныя стаянкі для машын.

Назіраючы ход урачыстасці, у мяне склалася надзея, што новая ўстанова стане важным і станоўчым фактарам пашырэння ўзаемнага супрацоўніцтва і добрасуседства.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота ІАЛАНТЫ КАБЗАР

Барыс Пятровіч

толькі да беларускамоўнай версіі. Гумянюк — паэт-з'ява, ён жа жывы класік і мадэрновы традыцыяналіст (і расхрыстаны дэндзі) — і яго творы заслугоўваюць перакладаў не толькі на польскую мову.

Gdzie, ja się pytam, jest telewizja?

Падзеяй „Бязмежжа" стала паэтычна-музычная сустрэча з паэзіяй Надзеі Артымовіч. Бельская паэтэса ўзяла голас пасля сямі гадоў маўчання. Уражанне, якое атрымалася пасля ўнушальнага аўтарскага чытання нельга параўнаць з нічым. Удалым дапаўненнем была музычная інтэрпрэтацыя зачытаных твораў, падрыхтаваная сужонствам Іалантай і Алегам Кабзарамі.

— To ja się pytam: gdzie jest telewizja? — замест каментара кінуў Міраслаў Грыка. Справа ў тым, што творчасць Надзеі Артымовіч малавядомая сярод

Фота ІАЛАНТЫ КАБЗАР

Надзея Артымовіч, Яўген Вапа, Паліна Качаткова

Бязмежжа 2003...

[1 ☞ працяг]

іх сябрам, каб пабачылі, як павінен выглядаць літаратурны часопіс. Не без уплыву астаецца і беларускі нумар „Картак" з 1997 года. Каштоўныя і паасобныя публікацыі перакладаў беларускіх аўтараў. Як прыклад тут асоба Юрыя Гуменюка, якога нават крытыка ўжо называе „гродзенскім беластачанінам"!

У Юрыя Гуменюка новы паэтычны зборнік: „Вуліца тыгровых архідэяў". Том з'явіўся два дні да „Бязмежжа", у ім лепшыя вершы ранейшых зборнікаў „Водар цела", „Твар Тутанхамона", „Рытуал"... На жаль, выдавец абмежаваўся беластоцка-польскіх эліт. Сама паэтэса не робіць захадаў дзеля прамоцыі ўласнай асобы. І зноў тая ж самая праблема перакладу — у Артымовіч няма асобнага, прыстойна афармленага польскага перакладу. І ўсе ранейшыя выданні трэба шукаць па бібліятэках і прыватным каналам у зборах кнігалюбаў.

Мэтафізічны настрой хвіліны ўдала папоўнілі паэтычныя чытанні Юры Плютовіча, Міры Лукшы, Віктара Стахвюка і Эдуарда Акуліна. Апошні праявіўся таксама як бард, яго „Крывія" сталася гітам восьмага „Бязмежжа".

Поспех у абмежаванні

Сёлетняе „Бязмежжа" на думку амаль усіх удзельнікаў было найбольш удалым і змястоўным. Пошукі „сфераў" прывялі да простай высновы. Каб утрымаць сякі-такі літаратурны працэс, трэба перакладаў, прамоцыі і сродкаў. Поспех „Бязмежжа" — у яго абмежаванні. Маецца тут на ўвазе ахова ўласнага літаратурнага панадворка. Наш патэнцыял шмат у чым перавышае польскамоўных суседзяў. Часткова высветліць гэта чарговы, трэці нумар „Правінцыі".

Кірунак і ў дзелавітым падыходзе да справы. Аказваецца, нават у Беларусі, можна разлічваць на партнёрства.

— Мы з задавальненнем надрукуем вашых аўтараў у „Дзеяслове", — прапанаваў Барыс Пятровіч. — Старонкі нашага часопіса адкрыты для вашых аўтараў.

Яўген Вапа — арганізатар і душа мерапрыемства справу ставіць ясна:

— Каб прыстойна выдаваць, прамаваць і выпускаць у свет беларускую літаратуру, патрэбны сродкі. Працэс, нягледзячы на цяжкасці і кашмармую сітуацыю ў Беларусі, дзейнічае.

Моц „Бязмежжа" першы дацаніў той жа Міраслаў Грыка:

— To trzeba już coś pisać, żeby znów zechcieli zaprosić!

Мне таксама хацелася б нашаму наведніку-кнігалюбу прапанаваць прозу Барыса Пятровіча — таксама ў перакладзе на польскую мову.

Ганна Кандрацюк

Узнагароды падляшскага маршалка

Падляшскі маршалак уручыў гадавыя ўзнагароды за дасягненні ў галіне мастацкай творчасці, распаўсюджвання і захавання культуры за сезон 2002/2003. Урачыстасць праводзілася ў антракце канцэрта з нагоды 50-годдзя ансамбля „Kurpie Zielone" ў беластоцкім Драматычным тэатры імя А. Вянгеркі. Узнагароды (статуэткі і па 7 тыс. зл.) атрымалі мастачка Яніна Кацярына Язерская, за мастацкія дасягненні ў развіцці ўзораў мэблі ў Польшчы, з асаблівым прызнаннем стварання прыязнага атачэння, перш за ўсё дзецям-інвалідам (заява Творчага згуртавання Студыя ўзорных формаў „Гайнаўка"), Анджэй Дырдал — за асаблівыя дзеянні для захавання культуры, яе распаўсюджвання ў краіне і за мяжой, а галоўным чынам за шматгадовую мастацкую працу з ансамблем песні і танца „Kurpie Zielone" (заява Падляшскага клуба бізнесу і Рэгіянальнага цэнтра культуры ў Збуйнай) і Станіслаў Загурскі, старшыня Грамадскага прэсазнаўчага таварыства „Stopka" ў Ломжы за асаблівыя заслугі для ахоўвання культурнай спадчыны, перш за ўсё за стварэнне Грамадскага прэсазнаўчага таварыства „Stopka", ініцыяванне мемуарных конкурсаў, ідэю і арганізацыю конкурсу на „Узнагароду і медаль Зыгмунта Глогера" (заява Галоўнага праўлення Таварыства сяброў Ломжынскай зямлі, Падляшскага ваяводы і Ломжынскага навуковага таварыства імя Вагаў).

Узнагароды назначаліся чацвёрты раз. Два дні да ўрачыстага аб'яўлення прозвішчаў лаўрэатаў з журналістамі з тае нагоды сустрэліся падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі, член ваяводскай управы Ян Сычэўскі (адказны м.інш. за справы культуры) і Галена Марцінкевіч з ведамства культуры Маршалкоўскай установы. У той час прозвішчы лаўрэатаў былі засакрэчаны.

— Вядома, быў клопат, каму прызнаць унагароду. Я прыняў толькі да ведама вердыкт камісіі, — сказаў маршалак. — Тыя ўзнагароды — адзін з інструментаў актывізавання асяроддзяў культуры і мастацтва.

Камісію ў сем асоб ачольваў літаратурны крытык Дарыюш Кулеша. У яе склад увайшлі прадстаўнікі, здаецца, усіх асяроддзяў культуры (мастацтва), сярод іх — вядомы культуразнаўца, адначасова інспектарка Падляшскай ваяводскай установы Валянціна Швед, у прыватнасці жонка вядомага беларускага паэта Віктара Шведа. Да гэтага часу ўзнагароды атрымалі дзевяць асоб: Анджэй Струміла, Марцін Налэнч-Несялоўскі, Эва Врочынская, Мікола Бушко, Казімеж Ушынскі, Віктар Волкаў, Яраслаў Антанюк, Віялета Бялецкая і Яраслаў Пэршка. Сярод сёлетніх намінаваных былі м.інш. ансамбль песні і танца „Kurpie Zielone" (заява Ваяводскага асяродка анімацыі культуры), Тамара Кердалевіч — дырэктарка Гміннага асяродка культуры ў Чаромсе (заява войта Чаромхі) і Барбара Кузуб-Самасюк, працаўніца ГАК у Чаромсе, заснавальніца гурту „Чарамшына" (заява войта Чаромхі і староства ў Гайнаўцы). Агулам арганізацыі, згуртаванні, самаўрады і іншыя ўстановы намінавалі сёлета 21 кандыдата, а найбольш бурмістр Чорнай-Беластоцкай, бо аж 8 асоб. Не было прадстаўніка былога Сувальскага ваяводства, скуль выводзіцца сам маршалак Кшыжэўскі. Дарэчы, і ў камісіі не было прадстаўнікоў Сувальшчыны.

— Падумаем аб гэтай справе, — сказаў на прэс-канферэнцыі маршалак Кшыжэўскі.

— Шмат асоб і ўстаноў не падавала заяў з-за ляноты, — тлумачыла Галена Марцінкевіч.

Пастановай ваяводскай управы былі назначаны таксама тры гадавыя творчыя стыпендыі на 2004 год.

— Сёлета прыярытэтам была музыка, — аргументавала Галена Марцінкевіч.

Першую са стыпендый атрымала народжаная ў Беластоку Анна Бярнацкая, на ўдзел у краёвых і замежных музычных конкурсах, з мэтай падтрымкі развою яе таленту і прамоцыі Падляшша. Другое — Альжбета Гжыбэк, за падрыхтоўку мастацкага цыкла на палатне метадам баціку і нетыповых габеленаў і сукняў, якія пасля знясцця з мадэлі становяцца элементам інтэр'ера. Трэцяя ўзнагарода дасталася Войцеху Земовіту Зыху, за скампанаванне II Сімфоніі. Яшчэ невядома, якія гэта будуць узнагароды. Як сказаў Ян Сычэўскі, стане гэта вядомым пасля прыняцця ваяводскага бюджэту. Прытым зазначыў, што пры ацэнцы стыпендыйных заяў прымалася пад увагу не толькі змешчанае ў іх абгрунтаванне, але і тое, якой славай цешацца тыя асобы ў асяроддзі:

— Кожны можа ж напісаць абстрактную заяву. (холм)

Вроцлаў і Гродна — гарады-пабрацімы

Яшчэ адзін горад-пабрацім з'явіўся ў Гродна. Стаў ім польскі горад Вроцлаў. Для заключэння адпаведнага пагаднення аб супрацоўніцтве ў Вроцлаве пабывала адмысловая дэлегацыя ад гарадскіх улад. Дакумент падпісалі старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандр Антоненка і прэзідэнт Вроцлава Рафал Дуткевіч.

Бакі дамовіліся рэгулярна абменьвацца карысным вопытам у планаванні, горадабудаўніцтве, камунальнай сферы, у арганізацыі перавозак пасажыраў, ахове акружаючага асяроддзя, сацыяльным абслугоўванні насельніцтва. Прадугледжаны абмены дэлегацыямі органаў мясцовага самакіравання, а таксама дасягненнямі ў гаспадарчых галінах, адукацыі і культуры. Намечана развіваць кантакты паміж навуковымі і культурнымі ўстановамі, абменьвацца мастацкімі і творчымі калектывамі, выстаўкамі, стажыроўкамі педагогаў, студэнтаў і школьнікаў, развіваць двухбаковыя спартыўныя сувязі. Пагадненне падпісана на пяцігадовы тэрмін, але пры ўзаемным жаданні бакоў яно можа быць аўтаматычна прадоўжана яшчэ на тры гады.

Старшыня Гродзенскага гарадскога савета дэпутатаў Барыс Казялкоў адзначыў, што Вроцлаў — другі польскі горад, з якім Гродна ўстанавіла пабрацімскія сувязі. З прыгранічным Беластокам падобнае пагадненне дзейнічае з 1961 года. Апрача таго Гродна падтрымоўвае пабрацімскія сувязі з французскім Ліможам, нямецкім Міндэнам і літоўскімі Друскенікамі.

БелаПАН

Беларусь патрэбна толькі беларусам

Адзін з прафесараў Універсітэта ў Беластоку публічна сказаў: „Białoruś przecież nie należy do Europy". Ці гэта быў жарт, ці гаварыў ён сур'ёзна ды прадстаўляў становішча ўсёй вучэльні — невядома, у кожным выпадку ніхто з прысутных, мясцовых вучоных, не стаў з ім спрачацца. Беларусь нават для польскай інтэлектуальнай эліты явіцца краінай з іншага вымярэння, а яе грамадства — цывілізацыйна запозненым.

Гэткі вобраз Беларусі доўгімі гадамі ствараўся ў сродках масавай інфармацыі, а палітыкі г.зв. еўрапейскай арыентацыі кожны дзень палохалі сваіх выбаршчыкаў беларускім варыянтам у выпадку, калі Польшча не ўвойдзе ў структуры Еўрасаюза.

Пра Беларусь як пра зруйнаваную краіну расказваюць таксама яе грамадзяне, асабліва інтэлектуалы, якія наведваюць Польшчу. Ад іх найчасцей можна пачуць параўнанне Беларусі з афрыканскімі дзяржавамі, якія ачольваюць напаўдзікія садыісты. Беларускія эліты хацелі б бачыць сваю радзіму ў Еўропе — і слушна. Перакананыя яны, што гэта адбудзецца зараз пасля таго, як Лукашэнка пойдзе сабе прэч.

Беларусь тым часам не надта адрозніваецца ад іншых краін Сярэдняй і Усходняй Еўропы. Часта маю нагоду параўноўваць гарады Польшчы і Беларусі, але вялікай розніцы не заўважаю. На вуліцах і тут, і там машыны заходняй вытворчасці. У Польшчы можа крышку гусцей іх, чым у Беларусі. У крамах адно і тое ж — тавары з усяго свету. Цэны таксама падобныя. Пакупнікоў больш аднак у беларускіх крамах. Людзі ў гарадах Беларусі, а прынамсі тая прыгажэйшая іх палова, апранутыя багацей за польскіх. Адны толькі грамадскія прыбіральні здраджваюць у Беларусі настальгію мясцовых уладароў за камуністычным светам.

Мінск, прынамсі яго цэнтр, памыты і падмецены, быццам Вена або Мюнхен. Метро дазваляе на працягу некалькіх хвілін перамясціцца з аднаго ў другі куток гэтага двухмільённага горада. У Варшаве, для параўнання, праезд аўтобусам або аўтамабілем пераўтвараецца ў доўгатэрміновую стаянку на закаркаваных вуліцах.

У матэрыяльным сэнсе Беларусь не надта адрозніваецца ад краін, якія неўзабаве стануць членамі Еўрасаюза. Не надта прывабліва выглядае яна аднак у палітычным ды нацыянальным плане. Ні ўлады, ні грамадзяне Рэспублікі Беларусь не ставяцца да сваёй дзяржавы як да найвышэйшай каштоўнасці, якая стварае ім умовы для існавання на прынцыпах цывілізаванай грамадскасці. Хеўра, якая ў 1994 г. захапіла ўладу, прадала ўсе сімвалы не толькі самастойнай дзяржавы, але і нацыянальнай годнасці. Патаптала яна малады беларускі патрыятызм, але грамадзян гатовых бараніць свой дом перад палітычным вандалізмам лукашыстаў, выявілася тады вельмі няшмат. Адукаваны люд пакорліва загаварыў нават на мове суседняга народа, якую запрапанавала кіруючая група. Мінскія еўрапейцы, якія ў Варшаве, нібы Рэйтан, рвуць на сабе кашулі ў роспачы над лёсам краіны, да сваіх сакратарак, жонак і каханак чырыкаюць „на языке". Можа і хацелі б нашы нацыянальныя эліты „людзьмі звацца", але чагосьці ім не хапае — перш за ўсё, волі адстойвання свайго.

У Еўропе, пра якую мараць беларускія дэмакраты, ніхто Беларусі не чакае. Там яна нікому і ні да чаго непатрэбная, хіба адно як прастора для транзіту расійскай сыравіны. Захад хоча толькі мець стабільную сітуацыю на дарогах і ў чыгуначных вузлах, а актуальны рэжым яму гэта і гарантуе. Лёс суседняй краіны не цікавіць і палякаў, якія на Беларусь глядзяць як на частку „рускага" свету. Насмешлівы тон тутэйшай публіцыстыкі вызначае пазіцыю краіны ды варшаўскай палітыкі. Беларусь перш за ўсё патрэбная самім беларусам. Пакуль у Гродне, Мінску, Віцебску, ці Магілёве не стануць шанаваць сябе — як супольнасці і дзяржавы — як свайго дому, на Усходзе і Захадзе будуць ігнараваць беларусаў — як гэта робяць зараз. Часам пры выкананні службовых абавязкаў нехта ветліва ўсміхнецца, прадэманструе сяброўства, зразуменне і спачуванне, але фактычна за маскай нашых „сяброў" найчасцей скрываецца ігнаранцыя і абыякавасць, а часам і пагарда.

У народаў выключна свае інтарэсы, а сябры ў іх толькі тады, калі ёсць нейкія супольныя мэты. Існаванне беларускай дзяржаўнасці ў мінулым найчасцей супярэчыла інтарэсам суседзяў. Сёння геапалітычная сітуацыя больш спрыяе беларусам, а лёс самастойнай Беларусі залежыць перад усім ад волі яе грамадзян. Найважнейшай праблемай нашых суродзічаў тое, што гэтую нескладаную ісціну разумее ўсяго іхняя знакамітая меншасць.

Яўген Мірановіч

Быць або не быць беларусам

Чацвер, 27 лістапада, адна з залаў Беластоцкага універсітэта запоўнена да апошняга месца студэнтамі, выкладчыкамі і сябрамі Сакрата Яновіча. Усе чакаюць спаткання з так супярэчлівай, у добрым сэнсе гэтага слова, асобай Падляшша, лаўрэатам узнагароды Дравіча.

Што абазначае быць беларусам? На такое пытанне паспрабаваў адказаць у час сустрэчы Яновіч і гэта яму ўдалося. Ужо на самым пачатку слухачы пачулі, што „быць беларусам, гэта раўназначнае з канспіратарствам. Цэлы час скрадаемся, рызыкуем, баімся, што браты палякі будуць глядзець на нас непрыхільным вокам, але толькі тут, на Падляшшы, у Беластоку, Бельску, але не ў Кракаве, Варшаве... А ў Беластоку трэба аб гэтым памятаць". Сакрат Яновіч не першы раз гаварыў аб сваёй дарозе да беларускасці, і аб тым, што „беларусам застаўся на злосць палякам", якія намаўлялі яго да польскасці, забараняючы ўласнага выбару, „бо хварэюць (палякі) ад многіх гадоў на антыўскасць, а беларусы гэта мова, царква, а цераз гэта простая дарога ў Маскву".

Быццё беларусам, як пераконваў пісьменнік, гэта цяжкая дарога да ўнутранага шчасця і спакою. Выбіраючы дарогу патрыёта, неабходная свядомасць, што цэлае жыццё будзем працаваць на сваю пазіцыю, вучыцца быць чалавекам культурным, „бо непісьменны, нептык і ідыёт ніколі такім не будзе. Людзі, якія называюць сябе беларусамі, гэта пераважна людзі больш інтэлігентныя ад палякаў, і тут справа не ў нацыянальнасці, а ў тым, што беларус увесь час працуе адчуваючы пагрозу. Калі б ён быў толькі беларусам, а ён яшчэ і праваслаўны! І гэта мяняе ўсё! Адносіны да сваякоў, суседзяў, светабачанне". У гэтых некалькіх сказах аўтар „Самасея" выказаў амаль усе праблемы, так малодшага, як і старэйшага пакалення несвядомых свайго паходжання беларусаў. А прыклады на гэта прыносіць жыццё...

Яновіч паказаў родныя Крынкі як месца, дзе беларускасць, звязаная з мовай і праваслаўем, выклікае амаль заўсёды камічныя або непрыемныя сітуацыі, спалучаныя з усведамлянням польскасці. Напрыклад, палякі абражаюцца, калі гаворым да іх пабеларуску, хаця добра ведаюць нашу мову, гаворачы ў такіх сітуацыях: „Co ty tak mówisz do mnie po prostemu, przecież ja nie durniejszy od ciebie!" А пісьменнік, так як кожны чалавек прыгавораны на сваю родную мову, на семантыку, якая сядзіць у яго нутры, ад якой нельга ўцячы.

Гаворачы аб асіміляцыі беларусаў празаік сцвердзіў, што галоўнай праблемай і трагедыяй меншасці з'яўляецца адсутнасць развіцця ў галінах культуры, палітыкі, якім не спрыяюць жыццёвыя і геапалітычныя абставіны. „Для беларусаў Беласточчына гэта айчына, а паляк усюды ў сябе. А жыццё, — як сказаў Яновіч, — заключаецца на адносінах паміж большасцю і меншасцю, якія з'яўляюцца лакмусавай паперкай здароўя дзяржавы. Калі меншасць не адчувае сябе добра, гэта абазначае, што ў гэтым грамадстве адбываецца нядобрае".

Спатканне Сакрата Яновіча датычыла няпростых спраў, пытанняў, на якія не знаходзяць, або можа баяцца знайсці адказы беларусы Падляшша. Поўныя жыццёвай мудрасці, дапраўленыя дробкай Яновічавай іроніі, адказы на беларускае „быць або не быць" у большасці слухачоў выклікалі неспакой, прымусілі задумацца, бо, як сам Яновіч гаворыць: „Люблю абражаць! Бо абражаны чалавек пачынае думаць, бо хваленне не развівае, што відаць па прыгожых дзяўчатах!" І няхай шкадуе хто ведаў і не прыйшоў на спатканне, бо такія спатканні адбываюцца нячаста!

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Вачыма паляка

Няўдачная ідэя дэпутаткі Цірук?

У апошні час на старонках лакальнай прэсы прабілася ідэя падляшскай дэпутаткі ад СЛД Барбары Цірук наконт змен у школьнай праграме. Да гэтай пары пані дэпутат, так сказаць, медыяльна стала існаваць з нагоды сваіх „трох грошаў", якія быццам мела яна дакінуць да новага закону аб радыёвяшчанні і тэлебачанні (закон — падстава да гэтак званай афёры Рывіна). Цяпер яна заклікае, каб адзін урок рэлігіі ў тыдні замяніць на... патрыятычнае выхаванне. Дэпутатка ў размове з „Кур'ерам Паранным" заявіла:

— Я ўпэўнена, што маладыя людзі паміж 10 і 18 годам жыцця не атоесамліваюцца з нашымі нацыянальнымі сімваламі.

Што мела б быць прадметам гэтых урокаў? Паводле пані дэпутаткі, азнаямленне з гісторыяй герба, біяграфіямі польскіх патрыётаў, навучанне песень з варшаўскага паўстання, „Багародзіцы", „Роты", „Boże, coś Polskę..."

— Сама не ведаю, ці заспявала б я чацвёртую страфу гімна...

Мяне гэтая якраз заява крыху здзівіла, бо найменш здзіўляе такое невуцтва ў парламентаркі, а калі так, не выпадае ж прызнавацца. Дарэчы, мо лепш падшколіць дэпутатаў і сенатараў у гімне краіны?

Ды не ў тым справа. На маю думку, рацыю маюць педагогі, якія сцвярджаюць, што патрыятызму навучае амаль кожны прадмет, як гісторыя, геаграфія. У школе як такога патрыятызму на ўроках навучыць немагчыма. Навучаецца яго (ці не) перш за ўсё дома, але таксама м.інш. не толькі праз сродкі масавай інфармацыі, рознага роду ўстановы, з якімі сутыкаюцца маладыя людзі, як, скажам, касцёлы і навукі якія з іх плывуць. Відаць, там ёсць хібы ў патрыятычным выхаванні. Чаму гэтак ёсць? На гэтае пытанне павінны адказаць сацыёлагі, псіхолагі і г.д. Напэўна ўсё, што асацыюецца маладым людзям з патрыятызмам, у польскім выкананні, зеўрае нудотай. Тыя ўскладванні кветак да помнікаў, высакапарныя словы выказваныя цяжкатраўнай для маладых мовай, ну, і, урэшце, для прыкладу, такое цынічнае выказванне дэпутаткі Сейма РП, што і яна не ўпэўнена ў веданні гімна.

Безумоўны рэфлекс пачуцця патрыятызму выклікаецца ў грамадствах, на думку сацыёлагаў і гісторыкаў, у сітуацыях пагражаючых бяспецы альбо суверэннасці краіны. Гэта датычыць таксама мясцовага патрыятызму на розных узроўнях. У спакойны час праяўляецца ён не толькі ў пустым веданні песень ці чыстых тэарэтычных ведах аб гербе і нацыянальных героях (дарэчы, з гэтым геройствам па-рознаму бывала, у залежнасці ад гістарычнага перыяду). Большая яго праява — адносіны да дзяржавы, сярод гэтага да кіруючых органаў, уласнага рэгіёна, горада, школы, працы, сям'і і г.д. Нялёгка гаварыць аб патрыятызме, калі дзве трэці грамадства не давярае Сейму і ўраду, значная большасць кепска ацаняе прэм'ера, людзі ва ўласнай краіне маюць цяжкасці з асноўнымі элементамі жыцця: працай, аховай здароўя ці спраўнасцю актаў правасуддзя. Да таго тая няшчасная карупцыя! Але і яна — праява заразнага, як пашыраючыеся сухоты, пачуцця недахопу патрыятызму.

Сёння, значыць, няпоўнае паўгода да заяўленага ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз, на маю думку, больш патрэбным было б увядзенне ў школьную праграму ўрокаў талерантнасці. І не тэарэтызаванне, а практычнае сутыкненне маладых з іншасцямі, размова з імі аб іншых, тлумачэнне крыніц. Перш за ўсё аб нацыянальных, этнічных і рэлігійных меншасцях. Гэтыя, пражываючыя ў Польшчы народы, этнічныя і рэлігійныя групы — большасць у краінах з'яднанай Еўропы і па-за яе межамі.

Не ведаю, аднак, ці камусьці хочацца думаць аб выхаванні ў такіх катэгорыях. Мабыць, задзіночаная Еўропа сама вымусіць на нас рэфлекс талерантнасці, так як у час пагрозы праяўляецца той рэфлекс патрыятызму. На гэта, аднак, няма чаго разлічваць. Можа паказацца, што, уваходзячы ў Еўропу, палякі са сваімі фобіямі і апаскамі, м.інш. нацыянальнымі ды рэлігійнымі, іншымі грамадствамі будуць ізаляваны, сапхнуты на абочыну з надпісам: *Ekstrema*.

Мацей Халадоўскі

Грошы, за якімі трэба хадайнічаць

3 лістапада г.г. Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі пачало акцыю інфармавання зацікаўленых вяскоўцаў, як правільна рыхтаваць заяўкі на атрыманне даплаты да ўгоддзяў, за якой можна будзе хадайнічаць пасля далучэння Польшчы да Еўрасаюза; акцыя будзе доўжыцца да канца сакавіка будучага года. Можна будзе разлічваць на даплату ў памеры 180 злотаў да кожнага гектара і на 280 злотаў да гектара засеянага збожжа.

У Арлянскай гміне такія сустрэчы адбыліся 5 лістапада: спярша ў Вульцы-Выгаеоўскай, а пасля ў Орлі. Найбольш карысных інфармацый давалі Валянціна Федарук з Комплексу сельскагаспадарчай кансультацыі, Марыюш Сікора, спецыяліст па справах геадэзіі з Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ды Эмілія Гаўрылюк з Падляшскай сельскагаспадарчай палаты — усе з Бельска-Падляшскага. У Орлі зацікаўленне парадамі было памяркоўнае — прыйшло каля сотні чалавек, у іх ліку шмат пенсіянераў, галоўным чынам уласнікаў 1-2-гектарных палеткаў. У Вульцы-Выгаеоўскай зацікаўленых было яшчэ менш.

У Орлі сустрэча адбылася ў школьным будынку. Сабраныя, сярод якіх былі і 70-годкі, заселі за партамі, быццам у дзіцячыя гады. З сучасных праектараў на белы экран паказаліся вялікія літары, табелі. Цікавасць суправаджаў добры гумар, быццам перад раздачай праверанных класных работ. А рыхтавалася гутарка пра грошы...

Марыюш Сікора паведаміў, што задачай навучаючых, вызначанай ім вярхамі, з'яўляецца інфармаванне ва ўсіх мясцовасцях у павеце. Пасля далучэння да Еўрасаюза ў польскую сельскую гаспадарку трапіць з саюзнага бюджэту 7,2 млрд. еўра (каля 29 млрд. зл.). У Бельскім павеце шанц пакарыстацца непасрэднымі даплатамі мае каля дзевяці тысяч гаспадарак і дзеля асведамлення іх уласнікаў адбываюцца такія навучанні.

За непасрэднюю даплату можа хадайнічаць кожны ўласнік гаспадаркі, у якой агульная паверхня ўгоддзяў не меншая чым 1 гектар і якая складаецца з, па меншай меры, 10-аравых участкаў (у Еўрасаюзе 30-аравых шырынёю ў 20 метраў). Заяўкі можна будзе заносіць у Павятовае бюро Агенцтва з 15 красавіка да 15 чэрвеня 2004 года, а грошы на рахункі сялян паступяць не раней 15 лістапада. Прамежны час будзе прысвечаны праверцы складзеных заявак; прадбачваецца праверка 10% іх. Гаспадарка плошчаю ў 10 абрабляемых гектараў павінна атрымаць даплату парадку 10 тысяч злотаў. Плата складаецца з двух кампанентаў: асноўнага — каля 200 зл. да аднаго гектара ворнай зямлі, пашы, лугоў, садоў і шматгадовых культур — і дадатковага — у сярэднім каля 250 зл. да аднаго гектара, дыферэнцыраванага паводле вырошчваемых раслін.

Пад канец сустрэчы Марыюш Сікора сказаў:

— Хто мае каля дзесяці гектараў угоддзяў можа атрымаць каля чатырох тысяч злотаў. Селянін усклікне: „А што ж гэта за грошы?!" Я з гэтым згодны, але пагляньце на свае гаспадаркі і падумайце, колькі трэба на іх напрацавацца і што з гэтага атрымоўваецца. Высветліцца, што яшчэ даплачваеце з дзедкавай пенсіі.

— А калі ўвядуць еўрасаюзныя складчыны ад фізічных асоб, — спытала з залы жанчына, — ці тады хаця на нуль мы выйдзем?

— Я ў палітыку не буду гуляць, — адказаў спецыяліст, — на яе мы не маем уплыву. Мы можам нешта супольна зрабіць і або зробім, або адвернемся плячыма і нічога не атрымаем. Удзел у даплатах неабавязковы і ніхто не будзе да іх нас прасіць. А гэта велізарныя грошы, за якімі трэба пахадайнічаць: напісаць заяўку, памерыць поле.

Хаця ўдзел у сістэме даплат дабравольны, аднак уласнікі жывёл будуць абавязаны значыць іх і весці дакументацыю ў рамках сістэмы ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі жывёл. З новага года, — сказаў Марыюш Сікора, — кожны селянін атрымае за аплатай метку-завушніцу — меткаўніца будзе ў солтыса — і сам будзе значыць нованароджаных цялят; да гэтай пары рабіў гэта ветэрынар. Пасля трэба будзе запоўніць адмысловы фармуляр і паслаць яго ў Бельск.

Апошняе пракаментаваў Аляксандр Ярымовіч з Орлі:

— Кажуць у народзе, што і свіням трэба будзе таксама завушніцы вешаць.

У зале раздаўся смех.

Сустрэча доўжылася каля трох гадзін. На канец сяляне маглі на практыцы паспрабаваць уласнаручна запаўняць фармуляры заявак. Атрымлівалася па-рознаму; і так, мабыць, будзе і ў жыцці. Яўген Амільяновіч з Орлі сказаў мне:

— Я мяркую, што старэйшым трэба будзе пытацца ў малодшых, могуць узнікаць праблемы. Мне справа ясная.

У час сустрэчы кожны яе ўдзельнік атрымаў матэрыялы: фармуляры заявак і абшырныя інфармацыйныя брашуры. З іх, так як і з праведзенага прывучэння, невядома, да якіх раслін будзе дадатковая даплата. Брашура называе каля трыццаці раслін, сярод якіх няма, на жаль, цукровых буракоў. А нашы сяляне вырошчваюць іх шмат, напр. у 2001 годзе ў Бельскім павеце цукровыя буракі вырошчвалі на 480 гектарах (у Арлянскай гміне — на 50, Браньскай — 204, Боцькаўскай — 137, Бельскай — 30, Рудкаўскай — 40 і Вышкаўскай — на 8 гектарах).

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Горы буракоў каля Орлі чакаюць транспарту

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гайнаўскія інвестыцыі

Ужо здаўна гаварылася ў Гайнаўцы аб будове крытага басейна. Зараз нанава выконваецца адпаведная дакументацыя. Будзе ён знаходзіцца побач Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы.

— Да канца гэтага года павінна быць гатова дакументацыя і, калі будуць сродкі са структурных фондаў Еўрасаюза, у канцы 2004 г. распачнем будову басейна, а ў 2006 годзе завершым. Інвестарамі будуць горад і павятовае староства. Уся інвестыцыя будзе каштаваць каля 11 мільёнаў злотых, — заяўляе бурмістр Анатоль Ахрыцюк.

Галоўны басейн — доўгі на 25 метраў і шырокі на 12,5 метраў. Дзеці будуць карыстацца меншым басейнам з абсталяваннем для гульняў. Будзе таксама труба для з'язджання даўжынёй у сто метраў. Наведвальнікі басейна змогуць карыстацца сухімі лазнямі. Плануецца, што басейнам да абеду будзе карыстацца школьная моладзь.

За карыстальнікамі басейна сачыць будзе электронная тэхніка. Гадзіннікі будуць лічыць час праведзены на басейне, а дадатковае абсталяванне будзе рэгістраваць, якімі атракцыёнамі яны карысталіся.

— Мы будзем рады калі басейн будзе максімальна выкарыстаны, бо тады кошт яго ўтрымання будзе меншы. Прадбачваем дакладаць да басейна ад 400 да 700 тысяч злотых штогод, — кажа Анатоль Ахрыцюк.

Паколькі будова басейна застаецца яшчэ ў сферы планаў, то перабудова гайнаўскага амфітэатра (на здымку) — рэальнасць. Многія будаўнічыя работы вядуцца ў ім гаспадарчым спосабам, пры выкарыстанні работнікаў фінансаваных Павятовым бюро працы. Зараз перабудоўваюцца месцы для гледачоў. Прадбачваецца, што ў час мерапрыемстваў змогуць сядзець дзве з паловай тысячы асоб. Тысяча людзей будзе магла стаяць каля сцэны, а тысяча — на ўмацаваннях за сядзячымі месцамі. Дах над сцэнай, гаспадарчыя і санітарныя памяшканні будуць прыдатны для арганізавання масавых мерапрыемстваў. Раней трэба было ставіць перасоўныя туалеты.

— У Гайнаўцы вялікае запатрабаванне на масавыя культурныя мерапрыемствы і таму спяшаемся з перабудовай амфітэатра. Будуць арганізаваны ў ім таксама некаторыя спартыўныя спаборніцтвы з пляжным валейболам, а зімою — каток, — дабаўляе Анатоль Ахрыцюк.

У бягучым годзе з удзелам камітэтаў жыхароў вуліц перабудаваны былі паверхні шасці невялікіх дарог і паложаны быў на іх асфальт. З бюджэту Гайнаўскага павета выдаткоўваліся сродкі на асфальтаванне вуліцы Ліповай і выкананне на ёй тратуараў. За сродкі Падляшскай управы ваяводскіх дарог быў асфальтаваны адрэзак вуліцы Беластоцкай.

— Зараз вядуцца размовы ў справе адкрыцця Раённага суда ў Гайнаўцы. Дзейнічаў бы ён на аснове замясцовых аддзяленняў Раённага суда ў Бельску-Падляшскім, якія ўжо цяпер знаходзяцца ў Гайнаўцы. Яшчэ вядуцца канчатковыя размовы паміж Міністэрствам фінансаў, Казначэйскай палатай у Беластоку, старостам і намі ў справе адкрыцця ў Гайнаўцы з пачаткам 2004 года Казначэйскай установы, — паясняе бурмістр. — Думаю, што не будзе ліквідацыі гайнаўскага замясцовага аддзялення Політэхнічнага інстытута, аб чым пісала прэса. На яго патрэбы будуць перададзены з пачаткам наступнага акадэмічнага года будынкі сённяшняй Падставовай школы н-р 5. Будзе яна пераселена ў памяшканні Гімназіі н-р 1 і будзе там створаны комплекс школ.

Аляксей Мароз

Вёска ці мястэчка?

У шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады, калі найлепш праквітала чыгунка, Чаромха так разбудавалася, што злучылася з навакольнымі вёскамі: Ставішчамі, Кузавай ды вёскай Чаромхай. Кузаву ад пасёлка раздзяляе рэчка Нурэц, Ставішчы — чыгуначны пераезд на лініі Чаромха — Брэст, адно паміж абедзвюма Чаромхамі застаецца вольны прамежак не большы чым 150-200 метраў. Можна сказаць, што ёсць схільнасць Чаромсе-Станцыі стаць горадам. Праўда, знайшліся адзінкі, што прад'яўлялі такія планы, але мясцовы самаўрад скептычна паставіўся да гэтай справы. Памерла яна затым сваёй смерцю.

На Гайнаўшчыне прынята, што Белавежу, Чаромху, Нараўку і Нарву называем пасёлкамі (osadą). Па-мойму, гэта незаконна, паколькі гэтыя мясцовасці не маюць правоў пасёлка (osiedlowych). Чаму ж тады на дарожных указальніках з надпісам мясцовасці чытаем: „Os. Czeremcha". Мне, напрыклад, гэта не перашкаджае, але хтосьці падумае, што мясцовы, як і павятовы самаўрады вылучаюць у салэцтвах „лепшых" і „горшых". А мо варта задумацца над справай і разважыць яе (выступаючы да кампетэнтных устаноў), каб гэтым чатыром мясцінам прызнаць статус пасёлка? Па-мойму, Белавежа, Чаромха, Нараўка і Нарва заслугоўваюць на вылучэнне, паколькі лічацца мнагалюднымі цэнтрамі з магчымасцямі далейшага развіцця ў прыгранічнай зоне. (ус)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сябры з Нараўкі з настаўніцамі беларускай мовы Аннай Кандрацюк (першая справа) і Ліляй Тарасевіч (другая злева)

Найразумнейшыя ў школе

— Я прыехала да вас, бо мне падабаюцца вашы артыкулы, — кажу замест прывітання.

Я ў Нараўцы. Мая „поўная цёзка" — настаўніца **Ганна Кандрацюк** — прадстаўляе сваіх выхаванцаў:

— Хай самі раскажуць пра школу і нашы справы, — прапануе.

Сядзім у сяброўскім паўкрузе ў настаўніцкім пакоі. У кампаніі адзін хлопец. Вайцех, як аздоба ў нашым і прыгожым коле. Пра маіх сяброў кажуць у Нараўцы: *найразумнейшыя ў школе!*

Першай бярэ голас **Агата Васільчык**:

— У нашай школе многа дзяцей; у ПШ — 270 вучняў, і 190 у Гімназіі. У найбліжэйшую суботу мы паедзем у Бельск-Падляшскі на конкурс „Сярод нас жывуць непаўнаспраўныя сябры". Поспеху для школы дабілася вучаніца трэцяга класа Кінга Дрозд. Яна — лаўрэатка першага месца. Кінга напісала апавяданне на беларускай мове.

Школа можа таксама пахваліцца лаўрэатамі конкурсу „Роднае слова". Сярод іх нашы сяброўкі: Уля Ігнацюк, Барбара Шусцік, Оля Бяляўская, Марта Матысюк.

Удзельнічалі мы ў Конкурсе гавэнды, у якім таксама маем лаўрэатаў — Марта Матысюк і Магда Каліноўская атрымалі вылучэнне.

Нараўка здаўна прымае ўдзел у Агульнапольскім конкурсе беларускай паэзіі і прозы. У мінулым годзе вылучэнні атрымалі Паўліна Нічыпарук і Мартына Леанеўская, сёлета лаўрэаткай з'яўляецца Уршуля Пташынская.

У школе ёсць таксама лаўрэатка прадметнага конкурсу па беларускай мове — Аня Патонец.

Марта Сухадола:

— Наша гімназія прыступіла да турніру „Беларускія гульні і забавы". У Бельск паехалі самыя актыўныя вучні, гэта была свайго роду ўзнагарода за працу. Мы не разлічвалі на прызы, турнір лічылі добрай гульнёю. Таму трэцяе месца было для ўсіх нечаканым поспехам.

Эмілія Патонец:

— У Бельску мы пасябравалі з гаспадарамі. Знаёмства з вучнямі бельскай „тройкі" наводзіла настрой весялосці. Мы нават ад іх атрымалі ў падарунку „гуску".

— З паперы? — удакладняю.

— Так, тую самую, што я выкарыстала ў якасці рэквізіту ў легендзе.

— А ці вы таксама нешта падарылі сябрам?

— Вядома. Мы, пушчанскія жыхары, падарылі ім грыбка — „маслюка"!

Паўліна Бяляўская:

— У панядзелак, пасля турніру быў *апэль* (школьная лінейка) і дырэктар яшчэ раз, у прысутнасці ўсіх вучняў, павіншаваў нас і ўручыў кубак пераможцаў. Пан дырэктар сказаў, што варта вывучаць беларускую мову.

Мартына Леанеўская:

— Я хачу расказаць пра Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. Конкурс дае нам магчымасць праверыць нашы здольнасці. Ад нас прыступіла да яго дзесяць асоб, вылучэнне атрымала Уршуля Пташынская. Мы рады з поспеху сяброўкі.

Вайцех Ляшчук:

— Мы прыступілі да праекта, які рэалізуе Гайнаўскае староства. Праект завецца „Давайце разам пазнаёмімся з нашым рэгіёнам". Праект накіраваны да вучняў прыпушчанскіх гмін — з Польшчы і Беларусі. Мы многа даведваемся пра сябе і нашых суседзяў.

— Першы крок вы ўжо зрабілі, — кажу сябрам з Нараўкі. — Наша рэдакцыя высока цэніць нарысы і легенды пра вёскі гміны Нараўка і Міхалова. Цэнім таксама сустрэчы з моладдзю, якая любіць свой родны кут і ўмее пра гэта расказаць.

Ганна Кандрацюк-Свярубская

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На ўрачыстасці падвядзення вынікаў конкурсу беларускай паэзіі і прозы. Першая злева — Уршуля Пташынская

Лета

Сонца свеціць
Лета спрыяе ўсім
І мы гуляць хочам
На лузе мяккім.
Разам з намі
Усе птушкі і звяры
Хаваюцца ад промняў сонца
У бярозкі цяні.

Просьба

Лета, развіні свае крылы
Каб свет стаўся ўсім мілы
Кветкі пахучыя няхай на лузе растуць
Дзеці на рэчку і азёры пабягуць.
Паклічуць нас гарачыя пляжы
На якіх сонца нас будзе смажыць
З радасцю вясну адпраўляем
Цябе лета ў госці запрашаем.

Зайчык

А хто ж гэта такі па лузе скача?
Гэта пэўна зайчык
Не можа быць іначай.
Зайчык скубае траўку,
Ад людзей хаваецца,
Ціхенька з травы
На дзяцей прыглядаецца.
Дзеці любяць зайчаняты,
Зловяць, дый возьмуць яго ў хатку.
Укінуць у клетку і дадуць травы,
Так праміне яго век малады.
Хавайся зайка ў высокай траве,
Няхай не ўбачыць чалавечае вока цябе.

Кветкі

Летам цвітуць кветкі
І пахнуць вельмі прыгожа
Нам марыцца
Каб была ў іх уся дарога
Кветак будзе многа
Ад пачатку да канца
Бо гладзіць іх сонца
Як цябе тата
Малайца.

Уршуля Пташынская,
Гімназія ў Нараўцы

Наталька

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Наталька Лаўранюк — вучаніца Пачатковай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім — лаўрэатка першага месца цэнтральнага конкурсу „Роднае слова”.

Бельская дэкламатарка падрыхтавала твор Эдзі Агняцвет „Бедны Саўка”. Наталля разумніца і акторка ў адным. Яе выступленне вылучалася ўнушальным і сэнсоўным пераказам тэксту і акцёрствам адначасова. Асабліва спрацавала міміка дэкламатаркі. Гэтую прыкмету мне нават удалося ўлавіць фотааб'ектывам.

Зорка

Яраслаў

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступленні дэкламатараў звычайна падыктаваныя прагай заваёвы ўзнагарод. З другога боку — узнагароды сімвалічныя. Дзеткі, проста, любяць спаборнічаць.

Сярод сотні дэкламатараў цяжка вылучыць усіх выдатнікаў. Часам пакаўзнецца нага — значыць — забудуцца ад хвалявання словы.

Выступленне Ярка Якацюка спадабалася за бойкасць і талковасць. Пра беластоцкага дэкламатара можна сказаць адно — ветэран! На сцэне ён ад прадшколля. І найфайнейшае тое, што ён надалей выступае ў „беларускай” кашулі з садка.

Яраслаў — вучань чацвёртага класа ПШ н-р 4 у Беластоку.

Зорка

Вершы Віктара Шведа

Добры татка

Вырашылі Ясь з Анелькай —
Прасіць татульку трэба:
— Дазволь прадаць твае бутэлькі,
Мы купім сабе хлеба.

— Мне даспадобы выхад гэткі,
У нас усё ў парадку.
Ды што б вы елі, мае дзеткі,
Калі б не добры татка?

Пазыка

Сустрэўся хітры Лёўка
З сяброўкаю Даротай.
Звярнуўся да сяброўкі:
— Пазыч мне сотню злотых.

— Я толькі сорак маю,
Якія даў мне тата.
— Я рэшту пачакаю,
Мне будзеш вінавата.

Зіма

Зіма прыйшла, сонца знікла.
Мы сумуем, нам прыкра,
бо зіма прыйшла,
няма сонечнага цяпла.
Наўкол толькі снег, мароз, зіма.

Зіма ідзе да нас

Зіма набліжаецца да нас
вялікімі крокамі.
Ужо сняжынкі бягуць да нас,
траву ўжо закрываюць,
белы дыван каля хаты раскладаюць.
Ужо зіма, ужо зіма набліжаецца.

Аксана Саснюк, VI „ц” кл.
ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Польска-беларуская крыжаванка № 50

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 46: Ас, самалёт, турнір, час, жарт, мост, тост, гонг, русалка, загадка, Лі, вада, кут, Ака, крок, халупка. Тэма, равок, слуга, сон, сад, ох, гадалка, мір, толк, жонка, чарга, карп, арт, лук, тост, гітара.

Узнагароды — магнітафонныя запісы беларускіх казак і песень — выйгралі: **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага, **Альжбета Антыпюк** з Арэшкава, **Раксана Казлоўская** з Новага Корніна, **Марта Кананюк**, **Уля Рашкоўская** з Нарвы, **Дарота Цімашук** і **Паўліна Паскробка** з Дубін. Віншуем!

Спонсар узнагарод — **Беларускі Саюз у Польшчы**.

Cykl	Brat	Obszar		Ryż		Pomidor
Dzika róża		Owoc				
Klasa					Fan	
Chlor	Przesłuchanie					

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Руіны замка ў Гальшанах

Замкі Беларусі

Замак у Гальшанах, які з часам быў перабудаваны ў палац, непадалёк Крэва. Пабудаваны ён на зломе XVI і XVII стагоддзяў княжацкім родам Сапегаў.

Абарончую функцыю выконвалі зямныя валы і бастыёны з сістэмай абваднення, якія знаходзіліся на значнай адлегласці ад палаца.

Замак меў тры паверхі, вежы і вялікі квадратны ўнутраны двор (60 х 60 м). Залы, галерэя і падвалы замка вылучаліся багаццем і здобленасцю.

Гальшаны палюбілі паклоннікі магіі і таемнага. З месцам звязаныя жахлівыя легенды і аповеды. Тут, паводле апошніх, знаходзіцца бяздонная яма — урочышча, дзе без следу знікаюць людзі.

Зараз палац зруйнаваны і занядбаны, як і ўсё мястэчка Гальшаны. Але, нягледзячы на апошняе, тут неацэнны патэнцыял для турызму, мастацтва і чараўнікоў.

На здымку бачым фрагмент падвалаў, у якіх захаваліся фланкіраваныя скляпенні.

Зорка

Пецькава мара

Марыў певень пра падарожжа. Ад дзяцінства пад крыламі матулі, разам з гурбой іншых куранятак — жоўтых пухатых братоў і сясцёр, пасля цікаўных падпеўнікаў і жвавых курачак, калі глядзеў на адчыненую браму, адчуваў прагу пабегчы ў свет. Што там пабегчы — паляцець! А ўдалося толькі разбегчыся, падскочыць, і ўзляцець на жэрдку. Вышэй за іншых курэй. І заспяваў Пецька хрыплым галаском маладога дваровага певуна, пахваліўся ўсяму свету, што, вось, апынуўся вышэй за іншых курэй. І каб так разам з ластаўкамі, што сядаюць на дратах ды свіргочуць, зводзяцца з яго, бегаючага па панадворку, а нават і з вераб'ямі, што частуюцца з курынага карытца! Ну, гляньце — такі верабей, колькі яго, а дзярэ дзюбу высока! Ніякай пашаны для большых! Пецька і злосны, і крыўдна яму — паглядзіце, атаман ён курэй, слухаюцца ўсе яго, перш за ўсё такога прыгожага, да таго ж разумнага, старанлівага гаспадара і мужа, і гаспадыня ім любуецца, хваліць, добра корміць... Жывецца ж няблага, у цёплым куратніку, і кампанія як трэба... Ну, можа той гусак — шыпун ды крыкун, ніякага класа ў такога няма, ні красы. І валочыцца са сваімі гускамі па лугах, цьфу, плавае ў бруднай вадзе ў раўчаку. Прыйдуць, напаскудзяць па ўсім панадворку! Нагергечуць, наверашчаць! Якія ў іх галасы — вось, ягоныя кабеты сакочуць, радыя са знесенага яечка, матулі квокчуць, з захаплення кудахтаюць, а сам Пецька — як жа ён пяе! І як тут кінуць такое месца, дзе яго паважаюць, даюць есці яму і ўсяму сямейству, і захапляюцца яго майстэрствам... Ах, а калі б у той свет! Увесь свет пачуў бы Пецькаву песню! Вось было б! На зайздрасць усім суседскім пеўням! На зайздрасць нават шпакам з вераб'ямі! Той бусел нават задзівіўся б, а ён жа з жонкай бывалыя ў свеце, хоць на спеве не разбіраюцца...

Устане Пецька рана-рана, спаць не можа. Усё думае пра падарожжа. Свет недалёка — зараз жа за брамкай дарога, па якой ходзяць людзі, каровы, сабакі, машыны... Ай, страшна! Трактар, несумненна, Пецькавым спевам не захопіцца. Як ні стараецца Пецька кукарэкаць, ніяк яго не перакрычыць. Пыхкае, вуркоча, раве той трактар. Якое тут мастацтва! Ледзь ад яго ўцячэш! А іншыя машыны! Усе яны пахнуць непрыемна і ніяк не баяцца пеўня, колькі б не лапатаць на іх крыламі, крычаць ды дзяўбці. Але калі б сыходзіць ім з дарогі, дайсці можна было б далёка ў той свет... Узысці на горку, разбегчыся, і па-аляцець! Не спіцца пеўніку... А тут узяла яго ахвота заспяваць. Ноч яшчэ, ну дык і што?!

Высунуў галаву Пецька з-пад крыла, пазяхнуў ды выгукнуў сваё кукарэку. Раз-другі-трэці. А тут і сонца пачало ўзыходзіць. Мабыць, пачула Пецькаў кліч, прачнулася.

— Ку-ка-рэ-ку! Не такі я недарэка! Я — Петручыо! — Пецькава вока адбліснула сонечнае праменне. — Вось, бачыце, сонца мяне паслухала! Ці вы гэта чуеце?

— Чуем, чуем, — адплюшчылі вочы старэйшыя, вопытныя куры і пасміхнуліся. Яны ведалі мары кожнага пеўніка пра падарожжа, каб спазнаць красу свету. І мару кожнае курачкі, каб не толькі яйка знесці ды чарвячка выкапаць смачнага. Ды гэта курыная таямніца, як і ўвесь птушыны сакрэт. А што людзям ды свету да такога! Важна, каб сонца ўзыходзіла!

Міра Лукша

Зберагчы ад забыцця

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

„Васілёчкі" на вяселлі

У прэзентацыі народных абрадаў „Зберагчы ад забыцця", якая адбылася 23 лістапада ў Гайнаўскім доме культуры, прынялі ўдзел калектывы з Гайнаўшчыны, Бельска-Падляшскага і Беластока. Выканаўцы выступілі з абрадамі, якія паказвалі ў маі гэтага года на конкурсным аглядзе ў Гарадку. Арганізатарамі мерапрыемства былі Гайнаўскі дом культуры і Галоўнае праўленне БГКТ. Сярод публікі, якая запоўніла канцэртную залу, былі: генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка, старшыня БГКТ Ян Сычэўскі і прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў. Дырэктар ГДК Андрэй Скепка, які адкрыў мерапрыемства адзначыў, што агляд, які ўпершыню праводзіцца ў Гайнаўцы, у наступных гадах будзе ўведзены ў каляндар пастаянных мерапрыемстваў.

Першымі выступілі жанчыны з Арэшкава са сцэнкай „Субота ў вёсцы". Высмейвалі яны сялян, якія займаліся непрыстойнымі гульнямі. Самадзейны калектыў „Расспяваны Гарадок" паказаў сцэнку „Капанне бульбы". Жанчыны, апранутыя ў даўнюю вопратку, прадставілі старыя прылады працы і завешаную на траяку палатняную калыску. Маладзіцам не дазвалялася аставацца дома, калі выконваліся палявыя работы. Яны вымушаны былі забіраць у поле сваіх маленькіх дзяцей.

— У наступным годзе будзем святкаваць пяцідзесяцігоддзе існавання калектыву. Хаця заснавалі мы яго ў 1953 годзе, то першы раз публічна выступілі ў студзені 1954 года. Напісала я многа сцэнарыяў, паводле якіх ставілі мы вясковыя абрады. Такім чынам паказваем малодшым вясковае жыццё ў мінулым, — сказала кіраўнік хору Ніна Цыванюк. — На сцэне выступілі мы з „таўканіцай" і „дранікамі" — харчамі, з якімі сяляне хадзілі калісь у поле. Сала елі толькі багацейшыя.

Калектыў „Чыжавяне" выступіў з „Агледзінамі". Жыхары Чыжоў у час такіх сустрэч гаварылі аб маёмасці сем'яў маладых, не шкадавалі самагонкі і закускі. У мерапрыемстве выступаў музычны апякун калектыву Анатоль Куніцкі. Апошнім часам калектыў шукаў музычнага кіраўніка. Анатоль Куніцкі прыехаў з Гродна і рыхтуе „Чыжавян" да музычных і тэатральных выступленняў.

— Новы кіраўнік добра нас вучыць і прыгожа іграе, проста не хапае слоў, — кажа Вольга Ахрымюк.

— Ужо сёмы раз выступаем сёлета з вясковым абрадам. Мы любім выступаць на сцэне, хаця пасля трэба спяшацца кароў даіць. Прэзентаваныя намі агледзіны ладзіліся калісьці ў нашай вёсцы, — гаворыць кіраўнік хору Марыя Якімюк.

Аліцыя Леанчук з ГДК, вядучая мерапрыемства, знаёміла публіку з калектывамі і рэпертуарам. Даўняе вяселле прадставілі „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага. Кіраўнік хору Мікола Мяжэнны паінфармаваў, што паказаны вясельны абрад у 90% згодны з вясковымі пераказамі з Бельшчыны.

— Трэба звяртаць вялікую ўвагу, каб абрады не страцілі аўтэнтычнасці, — кажа Мікола Мяжэнны — выкладчык Факультэта свят і абрадаў Гродзенскага каледжа мастацтваў. На Гродзеншчыне толькі пачынаюць паказваць на сцэнах вясковыя абрады. Яны загінулі ў большасці вёсак, паколькі працаўнікі калгасаў прыходзілі на працу, як на фабрыку.

— У калектыве „Васілёчкі" звыш 20 асоб. Раней і больш за 40 чалавек выступала, — гаворыць Ніна Бялецкая з „Васілёчкаў". — Хацелася б, каб маладыя дома не сядзелі і прыйшлі да нас паспяваць.

„Цаглінкі" са Старога Ляўкова паказалі абрад „Прыдання", а „Крыніца" з Беластока выступіла са сцэнкай „Адведкі". Абодва калектывы паказалі вясельныя абрады, заверашныя гасцінай.

— Раней агляды народных абрадаў праводзіліся толькі ў Гарадку. Пазней мы падумалі, што варта было б паказаць іх шырэйшай публіцы. У гэтым годзе самадзейныя калектывы з вясковымі абрадамі выступалі ў Беластоку, Бельску, Кленіках, Чыжах і Ласінцы, — праінфармавала сакратар БГКТ Валянціна Ласкевіч.

Аляксей Мароз

Тайны Белавежскай пушчы

Так называецца кніжка толькі што выдадзеная ў Брэсце.

„«Ракетны вожык» з беларускіх лясоў" — гэта загаловак першага раздзела. Ён удакладняе аб якіх сакрэтах мінулых гадоў пойдзе гаворка. У тыя гады на зямной кулі стаяла алавяная вайна і гонка ўзбраення неслася наўскач.

„Мы вам запусцім вожыка ў штаны!" — даслоўна такім „калючым" вастраслоўем адказваў на пагрозы супрацьстаўнага боку тадышні лідэр СССР Мікіта Хрушчоў. Гэтую фразу, якая стала крылатай, тады цытавалі газеты ўсяго свету. А падзеі развіваліся злавесна. Мір вісеў на валаску ад трэцяй сусветнай вайны. Вайны ядзернай.

З сярэдзіны 1960-х гадоў на самай акраіне савецкай зямлі — у лясах на захадзе Беларусі, спешна ствараліся ракетныя часці. Сакрэтныя пабудовы, сакрэтныя грузы... На тэрыторыі рэспублікі было разгорнута 155 установак стратэгічных ракет сярэдняй далёкасці. Яны былі нацэлены на аб'екты краін Заходняй Еўропы. Згодна савецкай ваеннай абарончай дактрыне гэта з'яўлялася сур'ёзным стрымоўваючым фактарам агрэсіўнай палітыкі НАТА.

Наш зямляк-беларус Яўген Кулін, выдатны вучоны (у мінулым яго імя не падлягала апавяшчэнню), блізкі паплечнік Сяргея Каралёва ўспамінае на старонках кніжкі. „Гэтыя гады для мяне асабіста можна параўнаць з гадамі, праведзенымі на франтах удзельнікамі вайны". Так, і мы таксама знаходзіліся пад чужым ядзерным прыцэлам.

Заходнія раёны Беларусі... Людзі цалкам мірных прафесій пражываючыя і працуючыя тут таксама мелі тады ўскоснае дачыненне да стварэння ракетна-ядзернага шчыта краіны. У сувязі з гэтым у эпізодах успамінаюцца імёны тадышніх старшыні калгаса „Рассвет" Пружанскага раёна Е. Кудзінава, інжынера з Брэсцкага электрамеханічнага завода У. Заламая, касманаўта П. Клімука, сакратара ЦК ВЛКСМ В. Грыгор'ева, намесніка па будаўніцтве Брэсцкага аблвыканкама С. Брыля, камсамольскага работніка В. Русакевіча.

Аб зусім сакрэтных у мінулым аб'ектах Савецкай Арміі ў лясах Заходняй Беларусі расказваецца па-рэпарцёрску жыва і цікава. Зрэшты, чытач пабывае і ў кабінеце галоўнага ракетчыка ЗША Вернера фон Браўна і ў падзямеллях ядзерных арсеналаў.

„Распад СССР. Погляд з Белавежжа". У гэтым раздзеле аб той жа рэзідэнцыі і тых жа падзеях у Белавежскай пушчы. Снежань 1991 года. Сумны час.

... Пра Белавежскую пушчу напісана многа добрых кніг. Але сярод іх не прападзе і гэтая яркая рэпарцёрская работа. Добра зразумелае жаданне журналістаў-аўтараў Анатоля Палонскага і Сцяпана Грыбенчука, у мінулым афіцэра і салдата ракетных войск стратэгічнага назначэння, яшчэ раз прыцягнуць увагу да нашай Белавежскай старонкі, да Беларусі.

„Тэрыторыя міжнароднага супрацоўніцтва і турызму" — завяршальны раздзел кніжкі: аб добрых людзях з беларускага і польскага Белавежжа, іншых краін, аб іх супрацоўніцтве.

У кнізе вельмі многа фатаграфій: і рэдкіх з „зусім сакрэтнага мінулага", і аб цяперашнім жыцці-быцці ў Беларусі.

Кніжка „Тайны Белавежскай пушчы" выклікае станоўчы вобраз Белавежжа, Беларусі. Безумоўна, яна пазаве чытача ў дарогу, „пакліча" заглянуць да нас на агеньчык новых падарожнікаў. Сярод іх будуць і проста дапытлівыя людзі, прыехаўшыя адпачыць, і дзелавыя людзі. Як дарагіх сугракае Беларусь, Белавежжа гасцей. Аўтары быццам запрашаюць: Прыязджайце — „ля высокіх бяроз сваё сэрца сагрэць!"

Іван Пятроў, дырэктар „Брэсткнігі"

„Арляне" на касетах і кампакт-дысках

Калектыў „Арляне" з Орлі, які амбітна дзейнічае ўжо 57 гадоў, упершыню атрымаў шанц прафесійнага запісу выконваемых ім беларускіх песень.

У справе запісу „Арлян" дырэктар Гміннага асяродка культуры Аліцыя Собунь звярнулася ў Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь з праектам „Для будучых пакаленняў". Запісванне адбылося 17 лістапада г.г. у будынку арлянскага ГАК, а запіс здзейсніла Студыя гуказапісу „Матрыкс" з Беластока. „Арлянам" давялося вырашаць складаную праблему: што выбраць для запісу са свайго багатага рэпертуару. Канчаткова з прыблізна шасцідзесяці песень рашылі запісаць звыш дваццаці; работа доўжылася амаль цэлы дзень.

Варта прыгадаць, што „Арляне" шматразова станавіліся лаўрэатамі конкурсаў беларускай песні ў розных катэгорыях. Выступленні „Арлян", у складзе якіх галоўным чынам пенсіянеры, прыцягваюць шырокую публіку і ініцыятыва іх запісу патрэбная. Гатовыя запісы на касетах і кампакт-дысках — тыражом па 50 штук — павінны паказацца ў продажы ў снежні г.г. Апынуцца там песні: „Пабываў у вёсцы Орлі", „Явар і каліна", „Полька беларуская", „Ой у дуброве" ў выкананні цэлага калектыву, „Ой чаромха белая" ў выкананні квартэта Ніна Шыманская, Яўгенія Хмялеўская, Зінаіда Навіцкая і Ніна Гаўзэ, „Чуеш, цябе я кахаю" дуэта Ніна Шыманская і Яўгенія Хмялеўская ды „Думаў жаніцца" ў сольным выкананні Уладзіслава Камарчука.

Міхал Мінцэвіч

Фота з архіва ГАК у Орлі

Калектыў „Арляне" ў час запісу

Запіскі з горада на Няве

Неўскі праспект

Гэта найважнейшая вуліца Санкт-Пецярбурга. Цягнецца яна ад Адміралцейскага праспекта да плошчы Аляксандра Неўскага. Ліквідаваныя на праспекце трамвайныя маршруты зрабілі яго быццам шырэйшым. Прагулка па праспекце — пастаянная змена ўражанняў. Строгія рады дамоў прарываюцца жывапіснымі панарамамі рэчак і каналаў, ансамблямі плошчаў прасторава звязаных з галоўнай магістраляй горада. На Неўскім праспекце і блізка яго згуртаваны мнагалікія помнікі архітэктуры і манументальныя скульптуры. Гэта вуліца тэатраў, кіно і канцэртных залаў, кавярняў, крамаў і ўстаноў. Нашу ўвагу перш за ўсё прыцягнуў Казанскі сабор, створаны ў 1801-1811 гадах. Вышыня яго разам з купалам — 71,6 м. Асаблівасцю яго з'яўляюцца дугападобная каланада, а ўнутры — 56 маналітных калон з чырвонага граніту, мазаічная рознаколерная мармуровая падлога. Сцены сабора пакрыты жывапісам і іконамі. Перад соборам стаяць помнікі вялікім палкаводцам М. Кутузаву і М. Барклаю дэ Толі.

На скверыку ля плошчы Астроўскага бачым новыя атракцыёны. У глыбі — Дзяржаўны акадэмічны тэатр драмы імя Аляксандра Пушкіна, вядомы мне са студэнцкіх гадоў, а ў цэнтры скверыка — помнік царыцы Кацярыне II. Яго падножжа акружаюць фігуры выдатных дзеячаў Расіі другой паловы XVIII стагоддзя. Пасля пайшлі мы па Неўскім праспекце ў напрамку Маскоўскага вакзала.

Метрапалітэн

Па-суседску з Маскоўскім вакзалам ёсць уваход у метро. З'ехалі мы на эскалатары ўніз і праз некалькі хвілін апынуліся ў вагоне. „Асцярожна, дзверы зачыняюцца. Наступная станцыя «Фрунзенская»", — такія словы чутны на кожным прыпынку. Без метро ў 5-мільённым горадзе вулічны рух быў бы невыносны, а даезды забіралі б многа часу.

Першая лінія метрапалітэна была адкрыта 5 лістапада 1955 года. Будова метро вялася з каласальнымі цяжкасцямі. Гразкі грунт, валуны, цвёрдыя гліны, падземныя рэчкі і азёры, часта ставілі перад будаўнікамі сур'ёзныя перашкоды. Часам прарывалася вада і залівала падземныя лініі.

Усе станцыі атрымалі архітэктурна-мастацкае афармленне, прысвечанае важнейшым падзеям гісторыі і сучаснаму жыццю горада. Напрыклад, афармленне станцыі „Аўтава", распаложанай на былой лініі фронту, апавяшчае аб гераізме абаронцаў Ленінграда ў час 900-дзённай блакады. Цяпер метро перавозіць больш за адну трэць усяго пасажырскага патоку, значыць больш за мільён пасажыраў.

Петрапаўлаўская крэпасць

Да Петрапаўлаўскай крэпасці даехалі мы падземкай пад Нявой. Пайшлі мы ў сабор св.св. Пятра і Паўла. Высокая званіца сабора з пазалочаным шпілем увенчана крыжам і флюгерам у выглядзе анёла ў палёце, раскінуўшага над горадам свае крылы. Анёл ахоўвае горад ад варожых сіл. Унутры сабора — амбон для пропаведзей, чаго ў асноўным няма ў праваслаўных храмах.

Галоўным упрыгожаннем сабора з'яўляецца пазалочаны іканастас і надпрастольная сень. Цэнтральная частка іканастаса зроблена ў выглядзе трыумфальнай аркі над царскімі дзвярамі і высока паднесена ў купальную прастору. Ёсць у саборы царскае месца — невысокі памост, дзе ў час службы стаяў імператар. Пасля сабор стаў імператарскай грабніцаю. У ёй 32 саркафагі. У саборы пакояцца астанкі Мікалая II і членаў яго сям'і расстраляных бальшавікамі ў 1918 годзе.

Неўская лаўра

Пабывалі мы ў Неўскай лаўры якраз тады, калі прывезлі астанкі апостала Андрэя Першазванага са Святой Гары Афон у Грэцыі. Пасля двухгадзіннага стаяння ў чарзе ўвайшлі мы ў сабор і пакланіліся святому, а святар усіх блаславіў і ўручаў іконкі з выявай святога і блаславеннем патрыярха Алексія II на адвароце іконкі. Мае сябры проста шчаслівыя былі, што ўдалося ім пакарыстацца такой небывалай нагодай.

Выйшаўшы з саборнай тэрыторыі зрабілі мы прагулку па набярэжнай Нявы. Шпацыруючы, дайшлі мы да гістарычнага крэйсера „Аўрора". Успомніліся мне словы вядомай песні „Што табе сніцца крэйсер Аўрора?" Ля крэйсера выстраілася чарга за білетамі на „Аўрору", якая цяпер з'яўляецца філіялам Музея ваенна-марскога флота.

Зрабілі мы яшчэ экскурсію і ў слаўныя прыгарады Санкт-Пецярбурга: Петрадварэц, Пушкіна (Царскае Сяло) і Паўлаў. Ездзілі таксама ў Вырыцу.

Міхась Хмялеўскі

Іканастас ніжняй царквы

Асвячэнне ніжняй царквы

Многа вернікаў сабралася ў храме Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля ў Гайнаўцы ў час асвячэння ніжняй царквы, якое адбылося 22 лістапада. Літургію ў саслужэнні святароў Гайнаўскага і Бельскага благачынняў узначаліў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава.

З раніцы адбылося малое асвячэнне вады, а святары прачыталі малітвы на асвячэнне ніжняй царквы. У час Літургіі асвяціўся прастол, на якім ляжаў антымінс з часціцамі мошчаў холмскіх і падляшскіх мучанікаў, і ўся царква. Праслаўленыя ў чэрвені гэтага года мучанікі ўпершыню былі выбраны на патронаў царквы. Прыхаджане, якія не памясціліся ў невялікай ніжняй царкве, перайшлі ў верхні храм, дзе пастаўлена была гукаўзмацняльная апаратура. Мітрапаліт Сава прыгадаў, што некаторыя з ліку патронаў царквы былі мучаны і загінулі на нашых землях. Памыліліся ганіцелі праваслаўных вернікаў, разлічваючы, што нічога не застанецца з цэркваў. Зараз будуюцца новыя храмы і адбудоўваюцца старыя, а ў іх збаўляюцца вернікі.

— Мы рашыліся асвяціць царкву ў дзень святкавання ў гонар іконы Божай Маці „Скорапаслушніца". У яе гонар будзе асвячацца верхняя бакавая царква, — заявіў настаяцель прыхода, протаіерэй Леанід Шэшка.

Ад пачатку кіраваў ён будовай царквы. Распачалася яна ў 1994 годзе, а ўжо ў 1999 годзе асвячаліся крыжы на купалах. Пастаянныя богаслужэнні ў храме адбываюцца з 4 снежня 2000 года. Іканастас і прастол у ніжняй царкве выканалі і пазалацілі майстры з Ковеля на Украіне. Яны таксама за ахвяраванні Міколы Гайдука з Гайнаўкі напісалі іконы ў іканастас. Завяршаюцца ўжо працы ў іканастасе верхняй бакавой царквы, у які іконы напісаў настаўнік Гайнаўскага белліцэя Міхал Юшчук. Зараз абкладаюць мазаікай іканастас галоўнай царквы Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля. Работнікі выканалі частку царкоўнай агароджы і туалеты. У будове царквы многа памагалі прыхаджане. Сярод іх вылучаліся стараста Ян Шыдлоўскі, Ян Раманюк, Анастасія Асіпюк, Марыя Кавальчук, Васіль Ляшук, Васіль Кучко, Уладзімір Буйноўскі, Мікола Сцепанюк, Лідзія Маркевіч, Антаніна Амельянюк і Зінаіда Міхноўская. Частку тэрыторыі вакол царквы прыход атрымаў дзякуючы намаганням войта Гайнаўскай гміны Вольгі Рыгаровіч, лясніка працаўніка Васіля Валкавыцкага і старшыні Жыллёвага кааператыва ў Гайнаўцы Уладзіміра Данілюка. У прыхадскіх працах настаяцелю памагаюць вікарныя святары: протаіерэй Георгій Ігнацюк і протаіерэй Іаан Гацута. Хорам кіруе Вірынея Кацюбайла. Мітрапаліт Сава падзякаваў усім, што памаглі будаваць царкву.

Аляксей Мароз

Фота Аляксея Мароза

У богаслужэнні прынялі ўдзел (злева) мітрапаліт Сава, протаіерэй Леанід Шэшка і мітрафорны протаіерэй Мікалай Шабелян з Семяноўкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Царква ў Грыбоўшчыне

Па слядах прарока (2)

Вуліца ў Старой Грыбоўшчыне вузкая, пад жвіровым насцілам. Вёска цывілізацыі непатрэбная, царыць там прыемная цішыня. Асталося некалькі хатак, я трапляю ў хату Канстанціна Чыжэўскага.

Калісь, — расказвае мне гаспадар, — да 1944 года жыло ў Старой Грыбоўшчыне трыццаць траіх гаспадароў. Саветы агітавалі да выезду ў СССР і палова вёскі выехала, галоўным чынам у бок Гомеля. Мо тры сям'і паехала на захад Польшчы, а рэшта падалася ў Беласток. Сёння ў вёсцы жыве пастаянна пяць душ; навесну прыязджае больш.

Ілья Клімовіч меў паўучастка ў Старой Грыбоўшчыне; тады зямля дарагая была. Прысніўся яму сон, каб царкву паставіць. Ён прадаў поле грыбаўшчанам, а сенажаць пад Валіламі прадаў камусь з Радуліна і стаў царкву будаваць. Людзі пабачылі, што добрую справу робіць, і далучыліся. Ішлі людзі здалёк, з Паўлаў, Цялушак, і ўсе ахвяры давалі царкву будаваць.

Царкву пачалі ставіць у 1909 годзе, ставілі нашы людзі. У 1917 годзе царква была накрыта саломай. Калі людзі вярнуліся з Расіі, накрылі яе гонтамі. А ўжо пры дэмакратыі, мо 10-15 гадоў таму, накрылі бляхаю.

Ілья быў сярэдняга росту, з барадою да пояса. Бацюшкі загадалі дзеду быць манахам пры царкве. І ён згадзіўся, але ўбачыў, што бацюшкі правяць, а ён не. Тады сутану з сябе скінуў і на хвойку павесіў, а царкву аддаў пад касцёл. Тады ўсе іконы забралі з царквы ў Валошынаву хату. Католікі паставілі плябанію, у якой пасялілі манашак, і студню выкапалі, і стадолу на станаўках абабітую дошкамі пабудавалі. Плябанія дзеравяная была, са зламанымі шчытамі і вялікімі вокнамі. Калі манашкі рана ўставалі, то ў хаце і мяне будзілі:

— Кастэнты, уставай, бо ўжо *аканнічкі* запалілі святло!

Сярод манашак дактарка была, а ксёндз прыязджаў на святы. Калі прыйшлі саветы, тады католікі без ніякай прынукі ўступілі ад царквы і праваслаўныя зноў яе занялі. Я сам памагаў насіць іконы і харугвы назад у царкву. А ў плябаніі хлопцы забавы рабілі, сельсавет туды памясцілі. Пасля немец забраў плябанію ў Новы Востраў, а там яе партызаны спалілі. І помпу немцы з Грыбоўшчыны забралі. А стадолу то людзі тут расцягнулі.

Ілья тварыў цуды. Прывезлі мужчыну шалёнага, якога ў хляве трымалі. Ілья маліўся за яго ўсю ноч, а пасля крыкнуў:

— Выйдзі сатана!

І таму хвораму адлягло. То зноў адна жанчына каўтанула пярсцёнак, Ілья памаліўся і пярсцёнак выйшаў.

З-пад Гродна, з Семярэнкі, сям'я прадала зямлю і сюды прыехала, каб быць разам з Ільёю і маліцца; яшчэ іх дачка ў Беластоку жыве. І іншыя людзі здалёк сюды ехалі.

Гаварылі, што царква з зямлі выйшла. З зямлі, бо за грошы ад продажу зямлі і была пастаўлена. А нам ён добра зрабіў, бо цяпер блізка нам у царкву. Адпраўляецца тут у кожную першую нядзелю месяца, на Ілью, Яна, Галавасека.

Ілью забралі тады, як гаёвых і паліцыянтаў, гаварылі, што гэта беларускі бог. Казалі, што ён лісты прысылаў, пісаў што 125 гадоў будзе жыць і яшчэ сюды вернецца.

* * *

У Студзёнцы дзве хаты: у адной гаёўка, у другой жыве сям'я Мішчукоў. Надзея Мішчук была апякункай апошніх паклонніц Ілы Клімовіча, якія дажывалі ў Вершаліне.

У 1939 годзе, — расказвае, — калі ўжо не было тут Ілы Клімовіча, у Вершалін прыйшоў Налівайка, які старшынём сельсавета ў Грыбоўшчыне быў, з энкавэдзістам, каб жанчын адтуль выкінуць:

— Гэта навалач, — гаварыў Налівайка, — яны цяпер сюды прыйшлі.

— Збірайцеся! — загадаў энкавэдзіст.

Было там чатыры жанчыны і сын аднае з іх, ён слабога розуму быў. Сталі яны пакавацца.

— А як тыя кветкі і пальмы будуць? — зацікавіўся энкавэдзіст.

— Гэта я іх садзіла, — сказала адна.

— І я, — дадала другая, — айцец Ілья вельмі любіў кветкі...

— Распакоўвайцеся! — сказаў энкавэдзіст строга глянуўшы на Налівайку. — Мы вас чапаць не будзем.

Жыло іх тут пяць: Надзя з Трасцянкі, Поля з Рыбал, Таццяна з Брэста, Гандзя з Гродна і Агафія з сынам з Паўлаў; гаварыла, што сын з печы ўпаў і галаву пашкодзіў. Трымалі дзве каровы, курэй, гусей, а пасля ўсё памаленьку ліквідавалі аж да апошняй кароўкі. Навокал хаты сена загатаўлялі, мой муж ім касіў, а я сушыць памагала. Таксама сеялі жыта і авёс, Мірон ім араў, а яны сярпамі жалі. Сечку рэзалі спярша рукамі, а пасля маторчык купілі.

У хаце ў Вершаліне, дзе яны жылі, была кухня і пакой. Цэлыя сцены ў пакоі былі завешаны іконамі. Абразы людзі прыносілі, а мой брат, сталяр, рамкі ім рабіў. Іконы ім былі даражэйшыя за кароў. Былі і каштоўныя іконы: тройчы ў іх хату прыходзілі зладзеі і кралі найдаражэйшыя абразы. Кралі тады, калі жанчыны ішлі ў поле, а хату калочкам замыкалі. Яны плакалі, маліліся, але на нікога не крыўдавалі. Міліцыя прыедзе, паглядзіць і далей нічога.

У Вершалін прыходзілі іншыя жанчыны. Галіна Верабей з Нетупы ў царкву не хадзіла, але хадзіла да жанчын у Вершалін; яна верыла толькі ў Ілью. Яе бацюшка не дазвозіў хаваць разам з іншымі і яе пахавалі ў кутку грыбоўскіх могілак. Прыязджала і Антолька з Радуліна, якую Булачкаю называлі; яна хацела каб яе каля Вераб'іхі пахавалі:

— Не хачу гіцляў бачыць! — гаварыла пра бацюшкоў. — Пахаваеш мяне ты, Павел, — сказала Валошыну.

Яна памерла зараз пасля ваеннага стану. Мы з Міронам памагалі яе хаваць, а Валошын так маліўся і спяваў як бацюшка.

(працяг будзе)

Аляксандр Вярбіцкі

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Сустрэча пасля дзесяцігоддзяў

У 1957 годзе было ім па дваццаць гадоў. Іван Боўтрык (першы злева) з былой вёскі Боўтрыкі і Сцяпан Новік з былой вёскі Лука сустрэліся ад таго часу ўпершыню 1 лістапада г.г. на могілках у Юшкавым Грудзе. Адзін другога не пазналі. А пасля доўга ўспаміналі свае маладыя гады: кавалершчыну, дзяўчат і хлопцаў — сваю маладосць.

Віктар Бура

Забытая магіла

Падчас нямецкай акупацыі праз вёску Патока, што ў Міхалоўскай гміне, праходзіла жыдоўская сям'я з двума дзеткамі. На яе след натрапілі праўдападобна шуцпаліцаі. Забралі яны тую сям'ю, прывялі ў лес ды сказалі бацьку выкапаць яму. Маці вельмі прасіла, каб аставілі ў жывых іхных дзетак, што яна заплаціць за гэта золатам. Але злачынцы застрэлілі цэлую сям'ю і закапалі ў лесе, які тады належаў да вёскі Бялкі, што ў Нарваўскай гміне. Цяпер гэты лес з'яўляецца дзяржаўным і належыць Надлясніцтву Жэдня.

Пасля заканчэння другой сусветнай вайны ў вёсцы Патока арганізавалі Пачатковую школу, кіраўніком якой быў Мікола Краўчук, шматгадовы былы карэспандэнт „Нівы". Апекаваўся ён жыдоўскай магілай, штогод парадкаваў, пасадзіў ліпкі, а дзеткі заўсёды ўскладалі кветкі на магіле. Прыемна было, калі ходзіш па лесе, зайсці ў тое месца ды перахрысціцца над магілай.

Перастала існаваць школа ў Патоцы. Спадар Мікола Краўчук перасяліўся на пастаяннае жыхарства ў Беласток, а магіла асталася адна ў лесе і няма каму ёю апекавацца. На маю думку, забытай магілай павінна заапекавацца Жыдоўская гміна ў Варшаве і паставіць помнік сваім братам у веры. А можа яшчэ дзе-небудзь пражывае найбліжэйшая сям'я або сваякі і не ведаюць, дзе пакояцца іх родныя?

Мікалай Лук'янюк

Калі ў селяніна благі настрой, хай не ідзе ў поле

Здаровы, як конь

Рабі, ажно ўпадзеш

Яўген Лявіцкі — нестары селянін. Разам з малодшым братам робіць на гаспадарцы, якую перадаў ім бацька перад сваёй смерцю ў 57 гадоў. Бацька пенсіяй (якую атрымаў па прычыне стану здароўя) нацешыўся паўгода. Яўгену 42 гады, але няўпэўнены, ці дажыве ён да пенсійнага ўзросту. Плаціць у КРУС усю страхоўку за сябе і брата; ледзь ім хапае за малако, якое прадаюць, выкараскацца з падаткаў і страхоўкі. А жыць жа трэба, карміцца. Што выгадуюць, тое і з'ядуць, а іншага не прададуць. А што ж то будзе ў Еўрасаюзе? — пытаецца Яўген, папальваючы танную цыгарэту, якую набыў у „рускіх". Нават і думаць не хочацца, агортвае адчай. Сказалі ў гміне, каб браўся за агратурызм. А каб пачаць, патрэбны фінансы. А чаго брацца, для каго рабіць? — пытаюцца бяззжэнныя хлопцы. Жанок не маюць, бо ніхто не хоча ісці ў вёску. А „бычковае" плаці!

Плаці, рабі. Селяніну, кажуць у месце, добра — ён і спаць можа, а яму само расце. Гаспадарыць можна, калі ў хаце ёсць ужо пенсіянер. Жывы пенсіянер — жывы грош у хаце. А калі няма падмогі? Яўген і Мар'ян — адны цяпер. І перабіваюцца з бульбы на квас. Адно кот не галодны ў іх, бо мышэй хапае. Не ў сябе зловіць, пойдзе да суседзяў. Або і ў пушчу збегае. Лес наўкола абступіў прыпушчанскія вёскі ды іхныя палеткі. Выдзірае зямлю, якую калісьці прадзеды выдзерлі ў пушчы. Самасеем зарастаюць аблагі. А Яўген не здаецца. Арэ, косіць, зжынае...

Ляжаў тыдзень. Схапіла сэрца, зварухнуца не мог. Ледзь разуў чобаты. Малодшы брат даіў кароў, упраўляўся. Урэшце запрапанаваў выклікаць скорую дапамогу. Старэйшы не здаваўся — не трэба, пяройдзе. Хто ж плаціць будзе? Думаеш, так хутка з Гайнаўкі прымчыць „пагатове"? Ідзі ты ў бальніцу, дык хваробу знойдуць! Урэшце, прыехалі. Паклалі Лявіцкага на рэанімацыю. Брату доктарка сказала, што праз тры дні яго выпішуць. Праз дзень пазванілі, каб прыехаў падпісацца, як адзіная сям'я — неабходна будзе цяжкая працэдура. Тлумачаць: хлопцу трэба на хвіліну выключыць сэрца, а пасля яго электратокам уключыць. То ён будзе як мёртвы? — злякаўся Мар'ян. А калі і не ўстане? Калі б была простая справа, дык не трэба было б подпісу радні? Па-латыні гэта *Fibrillatio aortium paroxysmus*... — Мар'ян вучыўся ў ліцэі, дык разумее... Форма сэрца ў брата пабольшаная, лук аорты выцягнуты, сэрца б'е хаатычна, мігатанне перадсэрдзяў... 15 студзеня ўсыпілі Яўгена, пасля ўключылі да новага жыцця. У час працэдуры прастыў, дык яшчэ два тыдні паляжаў з запаленнем лёгкіх. Прыпісалі супрацьінфарктавыя лекі ды адправілі, як інваліда, дадому ды лячыцца ў гмінных дактароў. Працаваць яму цяжка нельга. Ні насіць, ні падымаць. Значыць, гаспадаром ён быць не можа — ацанілі дактары ды запрапанавалі старацца ісці на пенсію.

Не прызнаем Пана няздольным

да працы ў гаспадарцы — сцвердзіла КРУСаўская лекарская камісія 6 чэрвеня 2003 г. Не сцвердзіла яна няздольнасці да самастойнай экзістэнцыі. Акрэсліла лёгкую ступень інваліднасці, „згодна з рашэннямі артыкула 4 закона 3 з 27.08.1997 г. аб прафесіянальнай рэабілітацыі". Лекарскае заключэнне — часовае, важнае да 30 чэрвеня 2005 г. Адклікаўся ў ваяводства. 17 ліпеня г.г. Беластоцкі аддзел КРУС паўтарыў заключэнне павятовай камісіі, адзначаючы, што пры актуальным стане здароўя няма падстаў палічыць Яўгена Лявіцкага няздольным да працы ў гаспадарцы. Лекарская камісія накіравала Лявіцкага на рэабілітацыю. Паколькі застрахаваны ён у КРУС, звярнуўся туды. 5 жніўня беластоцкі аддзел КРУС рашыў, што заява лекарскай камісіі КРУС накіраваць яго на рэабілітацыю „не можа быць рэалізаванай, па прычыне *przeciwwskazań zdrowotnych* да лячэбнай рэабілітацыі, рэалізаванай КРУСам". Іх „адмова накіравання на рэабілітацыю не абмяжоўвае" яго „да хадайнічання накіравацца на рэабілітацыю і санаторнае лячэнне, аб якім вырашае Нацыянальны фонд здароўя". Значыць, знайдзі час яшчэ раз ісці па лекарах, а гаспадарка чакае.

Блага табе — не лезь на фуру

Яўген Лявіцкі вярнуўся дахаты. Не апусціў рук, бо не мае на гэта часу. Ідзе ў поле — поўная кішэнь лякарстваў. Не забывай пра „нітрагліцэрын"! — асцерагаў доктар.

Чыноўнікі працуюць, ці сонца, ці дождж. Працуе і гаспадар. Каб звезці сена ці жыта, не будзеш адкладваць на заўтра. Палез на фуру, таптаць і ўкладваць сена. Пацямнела яму ў вачах, схапіла сэрца, і зваліўся з чатырох метраў паміж фуру і трактар. Ачнуўся, пайшоў дахаты. Назаўтра выбраўся з пабітымі рабрынамі да лекара. А КРУС паведаміў праз нейкі час. У пратаколе са здарэння, пацверджаным сведкам Васілём М. зазначана, што спазненне паведамлення не мела значэння ў рашэнні. Ды не належыцца яму аднаразовая кампенсацыя, паколькі здарэнне не было выклікана „вонкавымі фактарамі" ды „не меў удзелу ў гэтым сродак прадукцыі", а адбылося ўсё „па прычыне кепскага стану здароўя". І чыноўнікі далі параду селяніну: „Асаблівую асцярожнасць неабходна захаваць працуючы на вышыні. У час нагрузкі фуры нельга занадта набліжацца да берага, каб не дапусціць да ўпадку. Нельга прыступаць да працы ў выпадку дрэннага самаадчування і фізічнай нямогласці".

Ходзіць Яўген Лявіцкі ў поле з поўнымі кішэнямі лякарстваў. Але ж ён — здаровы. Не можа нават „падняць" рашэнне, плаціць ці не абавязковую страхоўку ў КРУС. Не заплаціць — забяруць яму за даўгі маёмасць. А чыноўніку заўсёды сонца свеціць.

Лукаш Правасуд

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

На пашы ў Орлі

Будучыня малочнай гаспадаркі

У бліжэйшыя два-тры гады ў малочнай вытворчасці адбудуцца істотныя змены, якія не мінуць і малочных кааператываў, і сялян нашага ваяводства. Еўрапейская камісія нізка ацаніла падгатоўку Польшчы да еўрасаюзнай акцэсіі; з яе рапарта вынікае, што Польшча ў многіх дзялянках рашуча адстае ад іншых кандыдацкіх краін. Амаль 90% польскіх малаказаводаў не трымае еўрасаюзных санітарных норм. Без адпаведных атэстацый польскія прадукты не ўвойдуць на рынкі аб'яднанай Еўропы, што на практыцы абазначае ліквідацыю многіх заводаў.

Сёння з 412 малаказаводаў патрэбныя атэстацыі мае толькі 48. У дамоўлены пераходны перыяд, г.зн. да канца 2006 года, санітарныя патрабаванні — прадбачваецца — задаволіць 150-170 далейшых заводаў; апошнія — амаль палову — чакаюць клопаты. Ужо ў кастрычніку г.г. 80 малаказаводаў абвясціла, што з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз спыніць сваю дзейнасць. Спецыялісты таксама мяркуюць, што ў 2007 годзе на рынку астанецца не больш чым 247 тысяч вытворцаў малака; сёння іх каля 870 тысяч — вытрываюць толькі найдужэйшыя.

Падляшскае ваяводства з'яўляецца малочным волатам, а працуючыя тут малочныя кааператывы належаць да найбольшых у краіне, аднак у маштабе Еўропы яны могуць аказацца драбязою. Сёння польскія малаказаводы заўзята спаборнічаюць між сабою за пастаўшчыкоў, а пасля 2007 года найменшыя з іх не маюць шансаў.

* * *

Можна сказаць, што калі не было Еўрасаюза, тады не было столькіх клопатаў. Ці гэта абазначае, што дагэтуль наша малако было такое дрэннае, а каровы не мелі прыстойных умоў бытавання? — пытаю лекара ветэрынарыі Юзафа Бжану — бельскага павятовага інспектара па справах гігіены біялагічнага матэрыялу.

— Працуючы раней звыш трыццаці гадоў у Арлянскай гміне, я ў сутнасці без гумовых ботаў не мог абысціся. А бывала па-рознаму: здаралася, што каровы стаялі пад дзіравым дахам, „пад хмаркай", стаялі ў гнаі да кален або хадзілі самапасам і трэба было набегацца, каб у кутку злавіць.

Гаспадары ў Арлянскай гміне першыя малочныя рэзервуары сталі абсталёўваць недзе ў 1990-1993 гадах і тады некаторыя суседзі часта высмейваліся з іх. Сёння лік гаспадарак з непасрэднай здачай малака нямнога пабольшаў: да дваццаці ў цэлай гміне. І здараецца так, што да ўладальніка такога рэзервуара даносяць малако ягоныя суседзі. Пасля неяк яны дзеляцца выручкай, але такі рэзервуар не можа мець атэстацыі. Калі апынемся ў Еўрасаюзе, лік атэставаных гаспадарак у Арлянскай гміне пабольшае да 30-40.

У агульнасці — усюды, і ў іншых гмінах, паменшаў лік гаспадарак, у якіх трымаюць па дзве-тры каровы. А праз некалькі гадоў у выніку старэння сялян і абязлюдзення вёсак лік пастаўшчыкоў малака яшчэ паменшае.

Цяпер, напрыклад, у Сямятыцкім павеце гадуецца каля 47 тысяч кароў (у Драгічынскай гміне 11 тысяч, а ў Гродзіскай — 12); падобны лік і ў Бельскім павеце. Трэба адзначыць, — сказаў у заканчэнне ветэрынар, — што ў абодвух паветах у гмінах з перавагай каталіцкага насельніцтва сяляне трымаюць больш кароў, чым у гмінах „праваслаўных".

Міхал Мінцэвіч

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пасля дзесяцігоддзя некаторага хаосу прафесіяналы нарэшце вяртаюцца на належнае ім месца...

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

— Чаму вы нічога не робіце? — папракае брыгадзір рабочага.

— Бо вы заўсёды паўтараеце: „Што маеш зрабіць заўтра, зрабі сёння". А заўтра нядзеля!

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Ты звольнілася з працы? Мабыць была гэта вялікая нечаканасць для твайго дырэктара?

— Не: ён пра гэта ведаў ужо раней ад мяне.

* * *

— Цябе, відаць, дырэктар звольніў з працы, — кажа сяброўка сакратаркцы.

— Адкуль гэта ведаеш?

— Загадаў вынесці тапчан са свайго кабінета.

* * *

Размова дзвюх сяброўак:

— Мне ўчора споўнілася дваццаць тры гады.

— А мне заўтра будзе дваццаць чатыры!

— Што ты пляцеш! Табе трыццаць, ты ж на год малодшая за мяне...

* * *

— З якога звярка тваё футра?

— З малпы.

— Выдатна, выглядаеш, быццам у ім нарадзілася!

* * *

Сяброўкі пасля гасціны:

— Цікава, колькі Бася заплаціла за тую пачварную спадніцу, якая так мне падабаецца?

Адгаданка

Вандал на Парнасе

(арыяда)

Апалон са світай злунаў у Беласток,
2 *Пранёсся фэстам і гурткоў парадам,*
Не праліваў з крыніц ваду ў ярок —
1 *Тутэйшых зрушыў міфічнай прынадай.*

— Клыпай і ты! — пачуў у вуха наш Вандал.
Крэкнуў стары і ціха пад Алімп падаўся.
II, 4 *Колькі аршынаў ён з мыліцай шагаў!..*
Усё ж на казачны Парнас дабраўся.

4, 2 *Глядзіць: там музы ў модных шараварах*
3, III *І Апалон аб лук пружыць мускул.*
2, 1, 2 *Кіфара стаіць міма, з люстрам разам...*
I, 2, III *Зірнуў — а ў ім паэт — Агаты аракул!*

(Ш)

Лічбы ў полі (арабскія) паказваюць нумар граматычнага склада, які хаваецца ў адпаведным радку. Рымскія лічбы абазначаюць, што знойдзены склад трэба чытаць у „арабскім" напрамку, значыць справа налева, напр.: калі б пад рымскай лічбай быў адгаданы склад „склад", яго для патрэб рашэння трэба было б прачытаць „далкс". Сукупнасць пачаргаваных складоў (тут: чатырох) складзе рашэнне.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 43 нумара

Алень, Асьют, Кабул, хмара, віскі.

Рашэнне: **Алесь Барскі**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Кахайма мядзведзя!

— Ой, якая ў мяне дэпр-р-рэсія! — неспакойна качаўся ў сваёй бярлозе перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва мядзведзь Сандар Жоржавіч. — Ніхто мяне не любіць. Старая звярына, дык яшчэ-яшчэ, а моладзь — ужо ж не так. Ой, якая ў мяне дэпрэсія!

Сабранае на паляне кіраўніцтва маўкліва і засяроджана лыбілася на апошнія даследаванні лясных настрояў.

— Нядобра-нядобра, — шаптала сама да сябе лань Гаўрусіха.

Заяц Генік паклаў па сабе вушы, псіхічна надламаны, ківаўся толькі на бакі. Вавёрка Кацюша бухала кітай у дубовы пень з такой злосцю, што дзяцел Стукач, які сядзеў на ім, ледзь трымаўся.

— Ну, хопіць гэтага! — не стрываў Стукач. — Няма чаго бедаваць. Калі маладняк не кахае мядзведзя, то хай сабе і не кахае.

— Але ж, гэта наша лясная будучыня, — роспачна енкнула Гаўрусіха. — Хто на старасць пракорміць іхнюю велічнасць? І наша высокае кіраўніцтва?

— Будучыня — наша, велічнасць і кіраўніцтва самі пракормяцца. Нас не перастае падтрымліваць агулам лясная брацыя. У ёй — наша сіла.

Тым часам на паляну ўкаціўся пануры Сандар Жоржавіч.

— Ой, якая ў мяне дэпрэсія, — прызнаўся, хістаючыся.

Загледжаная ў мядзведзя, быццам на малюнак двухногіх, лань паклала са спачуваннем сваю пярэднюю путавую костачку на карак свайго правадыра.

— Не перажывай, дарагі мой мішуцік, — уздыхнула. — Ты ж ведаеш , што ты — вялікі. Незаменны, адзіны. І да таго, так сказаць, мішкаваценькі, тады салодкі, як твой любімы мёдзік. Ты — сам мёд, — стагнала сваім грудным галаском лань і націскала ножкай на мілае цела правадыра.

— Ну-у-у... Я ведаю. Але наш маладняк недалюблівае мяне...

Па-дзятлаваму ўключыўся Стукач:

— Калі не кахае, дык пакахае. Хоча ён, ці не. Трэба да яго падыходу больш арганізаванага.

— Ну, дык як моладзь мае мяне пакахаць?

— А вось як. Мае ў яе быць такі святы абавязак. Падпішыце загад аб абавязку кахаць вашу мядзведжую велічнасць маладняком, і ўсе квіты, — падказаў Стукач.

Гэтак і было. На дрэвах усяго лесу з'явілася новае распараджэнне Сандара Жоржавіча. Маладняк з одумам учытваўся ў яго змест на бяросце.

— Кахаць... Гэтак лёгка сказаць, — словамі песні паўтарала ледзь адрослая ад зямлі звярына.

Аднак, выхаду ў маладняка не было. Мядзведзь, які ёсць, такім і будзе, ды звер гэта самы вялікі ды моцны. І калі змрок апусціўся на Сандараў лес, маладая звярына, гуляючы па ўзлесках, галёкала: „Кахаем мядзведзя! Вельмі яго кахаем!"

Сандар Жоржавіч, лежачы ўжо ў сваёй бярлозе, чуў, як выказваюцца ягоныя маладыя грамадзяне, тым больш, што стараліся выказацца і пад бярлогай.

— Ну, кахаюць жа ж мяне. Чуеце, я — любімы мядзведзь! Такі добры мішка я-я-я...

І з такімі думкамі засынаў. У сне гладзіў сябе лапай ды пяшчотна мармытаў:

— Я такі маленькі мішка, пацешны мішка, я сябрую з дзецьмі блізка...

Тым часам у адным з узлескаў змяя Ссапія, вуж Ззянон ды дзік Свіналыч падспеўвалі ціха рытуальную антымядзведжую песню:

— Стары мядзведзь моцна спіць, стары мядзведзь моцна спіць.... Мы баімся мішкі, робім усё спадцішку, бо прачнецца — дык нас з'есць!

А гучней падхоплівалі воклічы маладое лясное браціі:

— Кахаем мядзведзя! Вельмі ж кахаем нашага любімага мядзведзя!

Ноччу і моладзь ужо выспеўвала тое то гучней, то цішэй.

МакХолад

Буш пад ёлачку

Як пачнуцца святы, то канца няма. І паказацца трэба. І часта вацца. А пасля адхварэеш. Але свята на тое, каб чалавек цешыўся і адпачыў ад турботы буднага дня. Вось і адпачынак! Пакідае на потым. А каштуе ўсё тое не толькі здароўе. Але і чалавек сам чакае падарункаў і слоў памяці ад іншых. Ну, цяпер я чакаў падарунка ад Агаты з Амерыкі. З Філадэльфіі пераехала яна ў Чыкага. Там у аднае кабеты родам з Беларусі ўнукаў пільнуе. Старэнькая гаспадыніна маці-яўрэйка, як даведалася, што Агата па-беларуску ўмее, дык патрабуе, каб толькі на гэтай мове да яе азывалася. Мабыць, таму і выбралі Агату за няньку. Дык прыйшлося маёй жонцы і чужых унукаў няньчыць, і міжнародную канверсацыю весці. Затое, апрача гавэндаў з бабцяй ды малечамі не мусіць нічым займацца (да таго ж не дарам), бо там маюць асобныя і гаспадыньку ды кухарку. А ў Інтэрнэт Агата мае доступ, дык піша, што быццам у хаце сядзела, а ўвесь свет мае пад бокам. Суцяшае мяне Агата: „Не сумуй, Вандал, вярнуся. Крышку адвыкнем ад сябе, то як свежыя сустрэнемся..." Ну, вядома, суцяшае мяне і падарункамі. Асабліва пад святы... Ды што там падарункі, калі мілай гаспадыні дома няма... Да каго прытулішся? І Гарэшка сумуе. Ускараскаецца на мой ложак, прытуліць сваю рудую старую грудзіну да мае, царапне кіпцямі па маёй руцэ, пастогнем разам, паўздыхаем: няма бабы Агаты. Далёка! Ну, што яна там нам прышле? І мне, і Гарэшцы? Амерыканцы сваіх жывёл песцяць, як дзяцей.

— Сорак мільёнаў амерыканцаў, у якіх свая хатняя жывёла, выдасць, праўдападобна, больш грошай на святочныя падарункі для сваіх любімцаў чым на ласункі і цацкі для дзяцей. Асацыяцыя вытворцаў прадуктаў для звяроў АППМА, якая прадстаўляе каля 700 фірмаў, разлічвае, што будзе гэта сума пад 31 мільярд долараў, значыць, на 500 мільёнаў больш, чым у мінулым годзе, — кажу Гарэшцы, а тая сядзіць насупраць, лыбіцца на торбу, з якое маю намер дастаць ёй падарунак ад гаспадыні. — А ёсць што выбіраць. Найбагацейшыя могуць рашыцца на ложак для сабакі, высцілаць казіным валоссем, праектаваны Гучы. Гітам могуць быць „палітычныя" цацкі. За 13 долараў прыхільнік дэмакратаў можа набыць для свайго бульдога папісквачага гумавага Джорджа Буша. Рэспубліканец купіць хутчэй рэпліку прадстаўніцы Сената Гілары Клінтан. Можна выбраць таксама казначэйскага кантралёра ў цёмных акулярах ці Усаму Бен Ладэна. Жывёла мае рашаць сама, што з імі зробіць. А за сто долара, чуеш, Гарэшка?..

— Ч-ч-у-у-у-ю! — скавытнула мая сучка. — Га?

— За сто долараў, дзякуючы ўвядзенні на амерыканскі рынак японскай штучкі, уласнікі сабак урэшце могуць паразумецца са сваімі любімцамі. Паможа ім у гэтым ашыйнік-слоўнік, апрацаваны спецыялістамі па акустыцы і псіхалогіі звяроў. А можна яшчэ пакарыстацца інтэрнэтавай старонкай PetGuru.com (гуру для хатніх жывёл), тамака параіцца або купіць выдадзеныя ўласнікам старонкі кніжачкі за 10-15 долараў, якія дапамогуць вярнуць звяру ўнутраную раўнавагу.

— У-у-у-у-а? — здзівілася Гарэшка. — Н-у-у, да-а-а-ва-а-ай!

І я дастаў з пакета амерыканскі падарунак маёй сучцы — ядомага Буша.

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960